ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Згодна тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -адатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

ПЯТНІЦА, 28 сакавіка 1930 г.
№ 72 (3580)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Сёньня першы дзень генэральнае праверкі падрыхтоўкі да сяўбы

СОТНІ РАБОЧЫХ БРЫГАД ПРЫСТУПІЛІ ДА РАБОТЫ

Калгасы БССР, раўняйцеся па калгасьніках „Камінтэрна“ і „1-га мая“

РЭЗАЛЮЦЫЯ

Менскага Гарадзкога Партактыву па дакладу тав. ГЕЯ

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГЕЯ аб чарговых задачах калектывізацыі і пасеўнай кампаніі, сход менскага гарадзкога партактыву адзначае:

Правільная ленінская лінія, якую праводзіць наша партыя ў сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі, забясьпечыла вялізарныя посьпехі ў справе калектывізацыі. Гэтыя посьпехі, пацьвярджаючы цалкам і поўнасьцю правільнасьць генэральнай лініі партыі, зьяўляюцца лепшым адказам ныцікам, дэзэртырам з фронту сацыялістычнага будаўніцтва — правым апартуністам.

Партактыў цалкам і поўнасьцю далучаецца да дырэктыў ЦК УсеКП(б), ЦК і Менскага АК КП(б)Б, а таксама да ўстаноўкі, данай генэральным сакратаром ЦК УсеКП(б) тав. СТАЛІНЫМ у артыкуле «Головокружение от успехов», накіраваным на барацьбу са скажэньнямі лініі партыі ў калгасным будаўніцтве, накіраваным на ўмацаваньне дасягнутых у ім посьпехаў.

Партактыў заклікае менскую арганізацыю і ўсю КП(б)Б рашуча праводзіць гэтыя дырэктывы ў жыцьцё, вядучы барацьбу з мэтадамі адміністраваньня пры арганізацыі калгасаў, з перагібамі і недаацэнкай работы сярод батрацтва і беднаты. Актыў прызнае недапушчальным перакоскваньне праз асноўную форму калгасу — сельска - гаспадарчую арцель. Усе гэтыя скрыўленьні ня маюць нічога агульнага з лініяй партыі ў калгасным будаўніцтве, затрымліваюць калгасны рух і дапамагаюць клясаваму ворагу ў яго барацьбе супроць сацыялістычнага сэктару нашай гаспадаркі.

Партактыў адзначае, што ў падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі не дасягнуты бявныя бальшавіцкія тэмпы, якія зьяўляюцца неабходнай умовай для ператварэньня веснавой сяўбы ў сапраўдную бальшавіцкую кампанію. Актыў падкрэсьлівае, што ня ўсе арганізацыі да гэтага часу разгарнулі масавую работу сярод батрацкіх і бядняцка - серадняцкіх мас вёскі.

Адзначаючы недапушчальна слабы тэмп абагуленьня рабочай жывёлы, стварэньня кармавых запасаў, насеньных фондаў і абагуленьня буйное таварна-прадукцыйнай жывёлы, актыў прапануе ўжыць усе меры да таго, каб забясьпечыць выкананьне заданьняў партыі ў справе правядзеньня калектывізацыі. Разам з гэтым актыў падкрэсьлівае патрэбу забесьпячэньня пашырэньня пасеву яравога кліну і, у прыватнасьці, пашырэньня пасеву ў індывідуальных гаспадарках.

Выходзячы з таго, што сучасны этап калгаснага будаўніцтва зьвязан з арганізацыяй працы ў калгасах і вытворчасьці ў іх і зьяўляецца вельмі адказным, бо ад яго залежыць пасьпяховае правядзеньне пасеўнай кампаніі, замацаваньне існуючых і арганізацыя новых калгасаў, актыў лічыць патрэбным мабілізаваць увагу менскай партарганізацыі, усёй КП(б)Б і рабочае клясы на задачах практычнага замацаваньня дасягнутых посьпехаў у калектывізацыі, і далейшага яе разгортваньня, рашучай барацьбы з фармальна - бюракратычнымі адносінамі да дырэктыў партыі, з мэтадамі папярова - чыноўніцкага дыкрэтаваньня калгаснага руху, з перагібамі і скажэньнямі лініі партыі. Актыў лічыць патрэбным узмацненьне растлумачальнай работы сярод асноўнай масы сялянства, арганізацыі батрацтва—беднаты і ўцягненьня сераднякоў у справу калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Разам з тым, неабходна даць рашучы адпор імкненьням кулацтва скарыстаць у сваіх мэтах скрыўленьне лініі партыі ў калгасным будаўніцтве.

Актыў лічыць патрэбным згуртаваць увагу ўсяе партарганізацыі і рабочае клясы на сваячасовым і поўным правядзеньні ў жыцьцё ўсіх задач, пастаўленых партыяй, на разгортваньні палітычнай масавай работы па правядзеньні ў жыцьцё новага статуту сельска-гаспадарчых арцеляй, якія зьяўляюцца асноўнай формаю калгасу на даным этапе.

Партактыў менскай арганізацыі з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае патрэбу бязьлітаснай барацьбы з усялякімі панікёрскімі настроямі, маючымі месца сярод асобных членаў партыі, якія скажаюць лінію партыі ў справе калектывізацыі. Патрэбна рашуча і тэрмінова выправіць дапушчаныя памылкі і перагібы, спыніць рашуча ўсялякія разважаньні аб зьмене лініі партыі ў справе сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі.

Актыў заклікае менскую арганізацыю і ўсю КП(б)Б з яшчэ большай рашучасьцю змагацца з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, узмацняючы ўдары па «левых» загібах і па ўсялякіх спробах замаскаваць «левай» фразай праваапартуністычныя справы. Працаўнікоў, якія не падпараднякуюцца дырэктывам партыі і не праводзяць іх у жыцьцё, трэба зьнімаць з работы, аддаваць пад суд і замяняць вытрыманымі бальшавікамі, здольнымі выканаць і правесьці ў жыцьцё дырэктывы партыі.

Замацоўваючы дасягненьні калгаснага будаўніцтва, не паслабляць работы па далейшым пераводзе індывідуальнага сэктару на калектыўныя формы, на аснове добраахвотніцтва і ўмацаваньня ўжо арганізаваных калектываў.

За бальшавіцкія тэмпы ў веснавой пасеўнай кампаніі.

АРЦЕЛЬ—АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО

Набліжэньне сяўбы ў асноўных і буйнейшых сельска - гаспадарчых раёнах ставіць з вялікай вастратою пытаньне аб афармленьні раду калгасаў на статуце арцелі ў канкаткова зацьверджаным урадам тэксьце. Не падлягае сумненьню, што іменна арцельная форма калгасу ў тым выглядзе, у якім яна адлюстравана ў канчатковым тэксьце статуту, зараз найбольш прымальна для шырокіх мас сялянства. Ствараючы ўсе магчымасьці скарыстаньня пераваг буйное гаспадаркі ў асноўнай галіне сельскае гаспадаркі для павышэньня прадукцыйнасьці працы, разьвіцьця таварнасьці і, значыць, павышэньня агульнага матар'яльнага і культурнага ўзроўню сялянства, яна ня зьвязана з такою ломкаю быту, да якой масы яшчэ не падрыхтаваны.

Між тым, на мясцох яшчэ няма сьвядомасьці аб патрэбе пераводу на новы статут, як лепшага сродку, каб замацаваць посьпех калгаснага руху, ліквідаваць скрыўленьні і стварыць базу для далейшага разгортваньня калектывізацыі.

Гэтай павольнасьцю, а часамі і супраціўленьнем, якое аказваецца правядзеньню новага статуту, карыстаюцца варожыя элементы для зрыву абагуленьня сродкаў вытворчасьці, патрэбных для паляводзтва.

Спробам зрыву пераводу арцелі на новы статут трэба рашучым чынам палажыць канец. З афармленьнем калгасу на канчатковым статуце арцелі трэба пасьпяшаць. Афармленьне трэба скончыць да сяўбы, каб спаткаць сяўбу ва ўсеўзбраеньні гаспадаркі палітычнай падрыхтоўкай.

Наркамзем СССР сумесна з Саюзам Саюзаў, с.-г. каапэрацыі і Калгасцэнтру аддаў па тэлеграфу распараджэньне аб пераводзе ў бліжэйшыя-ж дні калгасаў на статут сельска - гаспадарчай арцелі шляхам масавай работы з калгаснікамі, з адначасовым згуртаваньнем усіх намаганьняў на падрыхтоўцы да сяўбы. Гэту работу на арганізацыі мас і афармленьні статутаў трэба правесьці ў тэрміновым парадку на аснове поўнага забесьпячэньня добраахвотнасьці і выбарнасьці. Усіх-жа работнікаў мясцовых апаратаў, якія супраціўляюцца ажыцьцяўленьню пастаноў партыі і ўраду, трэба замяніць лепшымі работнікамі.

(«ПРАВДА»).

ПЛЯН КАНТРАКТАЦЫІ

БУЛЬБЫ І ГАРОДНІНЫ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАН ДА 15 КРАСАВІКА ДЫРЭКТЫВА СНК СССР

МАСКВА, 27. Надаючы асаблівую важнасьць забесьпячэньню прамысловых цэнтраў гароднінай і бульбаю ў будучым годзе, Саюзны СНК даў дырэктыву Наркамгандлю СССР і ўрадам Саюзных рэспублік закончыць поўнасьцю выкананьне пляну кантрактацыі да 15-га красавіка г. г. У першую чаргу кантрактацыя павінна праводзіцца ў калгасах і прасьцейшых аб'яднаньнях агароднікаў, што нявыключае кантрактацыйных дагавораў і з індывідуальнымі агароднікамі прыгарадных і асноўных агародных раёнаў.

Учора з 8 гадзін вечара па тэлеграфу і тэлефону пачалі паступаць у рэдакцыю паведамленьні ад раённых і акружных камісій па правядзеньні генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы.

Да 2-х гадзін ночы атрыманы паведамленьні ад 43-х раёнаў.

На мясцох арганізаваны раённыя і акружныя камісіі. Рабочыя брыгады прыступілі да працы на мясцох, у калгасах і весках як дзе падрыхтаваліся да сяўбы.

Заўтра «Зьвязда» пачынае друкаваць першыя матар'ялы праверкі.

Камісія Менскага АК КП(б)Б прыступіла да працы

8 брыгад пачалі абсьледваньне акруговых установаў

Менскі акругком КП(б)Б ужо прыступіў да выкананьня дырэктывы ЦК КП(б)Б аб генэральнай праверцы падрыхтоўкі да сяўбы.

Пры акругкоме створана камісія пад старшынствам т. Жуковіча. У склад камісіі ўваходзяць наступныя т. т.—Перм—ад Саюзнага НКЗ, Каранеўскі—ад Менакрэз, Бягун—ад Менакрклгассаюзу, Маслоўскі—ад акругкому ЛКСМБ, Калодка—ад ЦСПСБ, Мітлін—ад рэдакцыі «Зьвязды», Шукевіч-Трэцьцякоў—ад рэдакцыі «Беларускай Вёскі».

Пазаўчора на пасяджэньні камісіі былі выдзелены 8 брыгад у складзе 36 чал., на якіх усклаўдзен абавязак абсьледаваць дзейнасьць менскіх установ у галіне падрыхтоўкі да сяўбы. У брыгады ўвайшлі рабочыя прадпрыемстваў: гарбарні «Бальшавік», фабрыкі «Камуніст», заводу «Дрэваапрацоўшчык», чыгуначнага вузла і інш.

На нарадзе брыгад, якая адбылася пасаўчора была растлумачана сутнасьць праверкі і былі раздаты праграмы абсьледваньня.

Учора а 9 гадз. раніцою брыгады прыступілі да працы. Абсьледуюцца наступныя ўстановы: акрзем, акркалгасаюз, акрселькрэдытсаюз, акрпаляводсаюз, Белсельтрэст, менаддзяленьне Белкаапсаюзу, Белсельснаб, менаддзяленьне Белсампрамсаюзу.

28-га сакавіка а 7 гадз. увечары ў памяшканьні АКК (КП(б)Б склікаецца нарада брыгад з удзелам прадстаўнікоў менскіх рэдакцый газэт. На гэтай нарадзе брыгадзіры будуць дакладваць аб праведзенай імі працы.

Паляводсаюз—камісіям па праверцы

Ня гледзячы на сваячасова даныя катэгарычныя дырэктывы, адпаведныя акруговыя арганізацыі, у тым ліку і паляводчая сыстэма, да гэтага часу ня ўжылі патрэбных захадаў да ажыцьцяўленьня месцамі агрыкультурных мерапрыемстваў, ад якіх у значнай ступені залежыць павышэньне ўраджайнасьці. У сувязі з такім становішчам, Белкалгаспаляводсаюз зьвярнуўся ўчора з тэлеграмай да ўсіх акруговых камісій па праверцы падрыхтоўкі да сяўбы з просьбаю зьвярнуць належную ўвагу на абсьледваньне працы акруговых установаў на ажыцьцяўленьні агрыкультурных мерапрыемстваў калгасамі і індывідуальнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі.

У гэтай тэлеграме Белкалгаспаляводсаюз адзначае, між іншым, наступныя моманты. Ачыстка насеньня яшчэ на сёньняшні дзень ня скончана ні ў адным раёне. Збожжаачышчальныя машыны не праведзены на двух і трохзьменную працу. Калгасы ня вывезьлі торф на палі, ня гледзячы на тое, што гэта было запрапанавана зрабіць яшчэ тры тыдні таму назад.

Зусім абураючае становішча наглядаецца са зборам попелу. Гарсаветы выдалі пастанову аб абавязковым зборы попелу ўсімі жаўтамі, домакіраўніцтвамі і прадпрыемствамі. Аднак, пераважная колькасьць домакіраўніцтваў і прадпрыемстваў усё-ж попел на зьбіраюць. Пастановы гарсаветаў ня выконваюцца, між тым самі гарсаветы ня прымаюць належных крокаў да ажыцьцяўленьня сваіх распараджэньняў. Да гэтага часу амаль ніхто не аштрафаваны за нязбор попелу.

Злачынныя адносіны праяўляюць адпаведныя арганізацыі ў Віцебскай, Аршанскай, Полацкай акругах да адгрузкі попелу на мэліяраваныя калёніза-цыйныя фонды. Віц попелу асушаных плошчы ня могуць быць засеяны. Між тым, ні адна з пералічаных округ, за выключэньнем Бабруйскай, не пачала адгрузкі попелу на калфонды. Віцебская акруга навіна была яшчэ месяц таму назад адаслаць 35 вагонаў попелу для камуны імя ВВА на Марэінскім калфондзе—не адгрузіла ні аднаго вагону і ня хоча выконваць пастановы ўпоўнаважанага па насеўкампаніі ў БССР. Аршанская і Полацкая округі павінны былі адаслаць на свае калфонды некалькі дзесяткаў вагонаў попелу, але за гэтай працы і ня думаюць прыступаць. Адна толькі Бабруйская акруга адгрузила 5 вагонаў попелу на Мар'інскі калфонд, замест... 30.

Бліжэйшымі днямі на ўсёй БССР павінна распачацца пратручваньне насеньня. Між тым, месцы яшчэ не паінфармаваны аб способах пратручваньня. І гэта ў той час, як округі яшчэ ў лютым атрымалі інструкцыі на гэтым пытаньні.

Усім акркалгаспаляводсаюзам запрапанавана 28-га сакавіка тэлеграфна паведаміць аб тым, якія канкрэтныя меры імі прыняты да зьнішчэньня адзначаных недахопаў, асабліва ў галіне збору і нагрузкі попелу і арганізацыі пратручваньня насеньня.

Пачалася праверка

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Акруговая камісія па праверцы падрыхтоўкі ўстаноў да веснавой сяўбы прыступіла да работы. Сёньня будуць праверены 10 акруговых устаноў. У праверцы прымуць удзел брыгады з рабочых, «лёгкіх кавалерыстых» і рабкораў. Учора ў акрземанддзеле, акркалгассаюзе, паляводсаюзе, малочна-жывёлагадоўчым саюзе працавалі брыгады з працаўнікоў гэтых устаноў па самаправерцы ходу падрыхтоўкі да сяўбы.

Апэрацыйная зводка з пасеўнага фронту

На 20-га сакавіка

Колькасьць калгасаў за апошнюю дзесяцідзёўку павялічылася з 3.633 да 3.658. Пры гэтым колькасьць гаспадарак у калгасах паменшылася з 440.285 да 376.136, а плошча пахаці зьменшылася з 2.700.000 гэкт. да 2.065.000 гэкт. (у круглых лічбах).

Разьмер калектывізацыі за апошнюю 10-дзёўку па ліку двароў зьменшыўся з 55,8 проц. да 47,7 проц., а па колькасьці плошчы з 65,4 проц. да 56,9 проц.

З агульнага ліку 315.000 галоў рабочае жывёлы, улічанай у калгасах, абагулена 149.000 галоў, або 41,6 проц. (супроць 38,7 проц. на 10-га сакавіка).

Разьмер ссыпкі збожжавых культур у абагуленыя фонды калгасаў дасягае 73,6 проц. Павялічэньня супроць становішча на 10 сакавіка няма. Разьмер ссыпкі тэхнічных культур за дзесяцідзёўку павялічыўся нязначна — з 27% да 29 проц. Ссыпка насеньня бульбы павялічылася з 49 да 51 проц.

Крыху павялічылася ссыпка насеньня траў — з 37 проц. да 38,6 проц. Значна больш павялічылася ссыпка лубіну—з 19 проц. да 30 проц., прычым гэтае павялічэньне ідзе выключна за лік Бабруйшчыны — 57 проц., Мазырышчыны — 56 проц. і часткова Меншчыны — 23 проц. У іншых округах ссыпка лубіну не перавышае 4—14 проц. Збор насеньня збожжавых культур камітэтамі сялянскай узаемадапамогі за апошнюю дзесяцідзёўку паменшыўся з 56,8 проц. да 51,2 проц.

Абменена газпуповага аўсу на звычайны — 7.755 тон што складае 58% выкананьня пляну (на 10-га сакавіка —46 проц.).

На 20-га сакавіка па БССР адрамантавана 98 трактараў, што складае 56% усіх трактараў, якія патрабуюць рэмонту.

Калі на 10 сакавіка была арганізавана 451 майстэрня для рэмонту с.-г. інвэнтару, дык на 20-га сакавіка колькасьць майстэрань павялічылася да 521. Адрамантавана 28.000 с.-г. машын, супроць 18.000 на 10-га сакавіка.

На 20-га сакавіка арганізавана 196 машына-конных станцый (паводле пляну 370). У машына-конныя станцыі зведзена 22.880 коняй.

Сабрана задатку на трактары 653.000 рублёў, што дае 31 проц. заданьня.

На 20-га сакавіка ачышчана 159.000 тон насеньня, што складае 82 проц выкананьня заданьня (на 10-га сакавіка—73 проц.).

Пачаліся палявыя работы

МАЗЫР, 27. (Наш. кар.). У ПАЎДНЁВЫХ РАЁНАХ АКРУГІ ПАЧАЛІСЯ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ.

СПРОБНЫЯ ВЫЕЗДЫ У ПОЛЕ

Калгасьнікі м. Княжычы падрыхтаваны да сяўбы

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Калгасьнікі мястэчка Княжычы ўжо падрыхтаваліся да сяўбы. Аб гэтым сьведчыць спробны выезд у поле, які быў гэтымі днямі наладжаны. У спробным выезьдзе прымала ўдзел каля 600 калгасьнікаў. Прыбыўшы ў поле, кожны з калгасьнікаў, разьмеркаваных па брыгадах, узяўся за выкананьне тэй працы, да якое ён быў прызначаны. С.-г. машыны, вупраж аказаліся ў поўнай спраўнасьці.

Калгасы „Камінтэрн“ і „1-ае мая“ ўперадзе

Па радзе калгасаў Слуцкага раёну падрыхтоўка да сяўбы пераведзена на сапраўды баявыя тэмпы. У калгасе «Камінтэрн» (Цараўскі сельсавет), напрыклад, ужо падрыхтаваны інвэнтар, абагулена ўсё насеньне і рабочая жывёла. У калгасе «Камінтэрн» створан непарушны кармавы фонд на час палявых работ. Плян палявых работ шырока абмеркаваны на сходзе беднаты і батрацтва і на агульным сходзе калгасьнікаў. Плошча пад яравы клін адведзена. На 30 сакавіка ў калгасе прызначан дзень агляду і рамонту зброї.

24-га сакавіка члены калгасу «Камінтэрн» нападзілі спробны выхад у поле, які паказаў поўную падрыхтаванасьць калгасу да сяўбы. У гэты-ж дзень была створана брыгада з 17 фурманак, якая пачала вывозіць гной на поле.

Узмоцненым тэмпам заканчваецца падрыхтоўка да сяўбы ў калгасе «1ае мая» (Урэцкі сельсавет). Усе калгасьнікі разьмеркаваны па брыгадах. Па ініцыятыве саміх калгасьнікаў імі зьвіты новыя пастаноўкі для кожнае зпражкі. Створана ўласная машына-конная станцыя. 30-га сакавіка адбудзецца спробны выхад у поле.

Аднак, далёка не па ўсіх калгасах з падрыхтоўкай да сяўбы справа стаіць добра. Калгас імя Розы Люксэмбург, напрыклад, да гэтага часу не зямляўпарадкаваны. Калгасьнікі ня змаглі ня ўзяць частку РВК з просьбай прысласць каморніка. Каморніка ўсёяшчэ ня прыслалі. У выніку—невядома, дзе і што сеяць.

У калгасе «Рухавік» не хапае насеньня культурных траў каля дзьвёх тон і с.-г. інвэнтару—двухлямешных плугоў і барон. Кепска ў гэтым калгасе і з кармавымі фондамі. Не хапае каля 1.500 пуд. сена і саломы.

Брыгадзір «Зьвязды» КАРАЧУН.

БССР атрымае 25 трактараў за ўтыль

Наркамгандаль БССР атрымаў паведамленьне, што для Беларусі ўжо адгружаны першыя 25 трактараў са спэцыяльна вылучанага фонду за сабраны ўтыль. Трактары будуць перададзены ў тыя раёны, якія перавыканалі свае пляны па зборы і загатоўцы ўтылю, у гэтых раёнах будуць арганізаваны трактарныя калёны.

Пры ўмовах поўнага выкананьня плянаў па зборы ўтылю, БССР зможа атрымаць 600 трактараў звыш плянавага забесьпячэньня.

Пасьля ультыматуму Пілсудскага сойму

Як ужо паведамлялася ў друку 25 сакавіка Пілсудскі прад'явіў сойму ультыматум.

З прычыны гэтага учаравшні дзень у сойме прайшоў надзвычайна бурна і мае значэньне пераломнага моманту. У часе пасяджэньня сойму Главэк на чале некалькіх дзесяткаў дэпутатаў беспартыйнага блёку ўварваўся на пасяджэньне бюджэтнай камісіі і паладзіў абструкцыю. З прычыны таго, што э-за абструкцыі ня было чутко дакладчыка, старшыня загадаў прынесьці дошку, на якой крэйдай запісвалі прапанаваньні дакладчыка. Пілсудцкі выкінулі дошку ў калідор. Адзін з пілсудчыкаў схапіў крэсла і пачаў стукаць на стале старшыні. Ня гледзячы на надзвычайны лямант, ламаньне мэблі і крыкі, старшыня давёў пасяджэньне да канца.

Ультыматум, які прад'явіў Пілсудскі сойму, зусім зьбіў з толку парляманцкую апазицыю. Нэрвовы настрой у сойме і апасеньні апазіцыі яшчэ больш павялічыліся дзякуючы выступленьню да ультыматума Пілсудскага. У гэтым выступленьні было заяўлена наступнае: «З Польшчай лічацца заграніцай толькі таму, што ў нас карэнным чынам змянілася сыстэма дзяржаўнай работы. На што раней траціліся 10 гадзін, дык тое робіцца цяпер у 10 хвілін».

Дэкларацыя, прачытаная ад імя цэнтральнай групы, прапануе пілсудчыкам зьмяніць мірным шляхам існуючы ў Польшчы лад. Больш рашуча арэдгавана заява нацыянал-дэмакратаў, якія ня адмаўляюцца ад правоў і абавязкаў, якія на іх накладае канстытуцыя.

У палітычных колах мяркуюць, аднак, што Пілсудскі калі нават і адважыцца на канчатковае зьнішчэньне [illegible] і абвяшчэньне новай канстытуцыі зьверху, дык ва ўсякім выпадку не адразу, а ў некалькі прыёмаў.

26-га сакавіка прэзыдэнт даручыў утварыць габінэт брату Пілсудскага дэпутату беспартыйнага блёку. Ян Пілсудскі прапанову прэзыдэнта прыняў.

Кандыдатура Яна Пілсудскага—чарговы трук

ВАРШАВА, 27. Пастанова прэзыдэнта даручыць фармаваньне новага габінэту Яну Пілсудскаму была для палітычных колаў яшчэ большай неспадзяванкаю, чым ранейшая спроба даручыць гэту справу Пыманскаму. У палітычных колах падазраюць, што кандыдатура Яна Пілсудскага зьяўляецца чарговым трукам, разьлічаным на тое, каб выйграць час.

Новы кандыдат на пост прам'ера пачаў з таго, што запрасіў на нараду прадстаўнікоў парляманцкіх фракцый. Ян Пілсудскі разьлічвае ўжо ў пятніцу скласьці габінэт. Прадстаўнікі нацыянал-дэмакратаў лістоўна адмовіліся прыбыць на нараду з Янам Пілсудскім. Цэнтра-левы блёк намерены пасласць на нараду з Янам Пілсудскім толькі аднаго прадстаўніка. Такім чынам, пераговары могуць скончыцца яшчэ скарэй, чым думаў Ян Пілсудскі.

Ян Пілсудскі заявіў прадстаўніком прэсы, што трэба зрабіць большы націск, каб дабіцца больш шчырага супрацоўніцтва паміж соймам і ўрадам. Некаторыя органы друку лічаць, што калі Яну Пілсудскаму таксама ня ўдасца скласьці габінэт, дык на сцэне зьявіцца сам маршал Пілсудскі.

БЕЛАРУСКІЯ ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ Ў ПОЛЬШЧЫ ПА-ЗА ЗАКОНАМ

Масавыя арышты рабочых і сялян, барбарск'я катаваньні арыштаваных па дэфэнзывах, зьверскія зьбіваньні дэпутатаў рабоча-сялянскага блёку—штодзённыя зьявішчы ў фашысцкай Польшчы

Прамова пасла І. Гаўрыліка з Беларускага Сялянска-Рабочага Пасольскага Клюбу, сказаная ў сойме 25 лютага 1930 г. у спрэчках адносна абежніка міністэрства ўнутраных спраў аб пасольскіх сходах

Пастанова, якая абмяркоўваецца тут і адназгодна прынята адміністрацыйнай камісіяй, зьяўляецца красамоўным дакумэнтам дня. Яна датычыць прапановы ППС, Вызваленьня і Сялянскай партыі аб скасаваньні абежніка міністэрства ўнутраных спраў, які ставіць у залежнасьць арганізацыю пасольскіх сходаў ад дазволу адміністрацыйных улад. **Гэты абежнік**, які бязумоўна, пярэчыць канстытуцыі, абмяжоўвае пасольскую недатыкальнасьць і правы мільённых мас выбаршчыкаў, зусім відавочна **накіраваны супроць рэвалюцыйных рабоча - сялянскіх мас, супроць працоўных мас Беларусі, Заходняй Украіны і ўсяе Польшчы.** Калі ў сваёй практыцы адміністрацыйныя ўлады часамі перашкаджалі скліканьню сходаў сацыял-фашысцкіх паслоў, а таксама беларускіх і украінскіх згодніка, дык асна, што яны гэта рабілі ня з прычыны страху перад пасламі, а з анаскі перад выбаршчыкамі, якія ўсё менш вераць згодникам, усё лепш пераконваюцца ў іх палітычным здрадніцтве і ўсё больш рашуча выступаюць на шлях рэвалюцыйнага змаганьня супроць фашызму.

Толькі што, у часе так званага «змаганьня» сойму з урадам Сьвітальскага, у часе ўзмоцненых «апазыцыйных» маневраў — соймавая «дэмакратычная» лявіца, так званая ППС, Вызваленьне і Сялянская партыі, узьняла буру з прычыны памянёнага абежніка фашысцкага сатрапа — міністра Складкоўскага, сьцьвярджаючы, што ён «бязумоўна супярэчыць канстытуцыі, б'е па «дэмакратыі», правапарадку і іншых падобных сьвятынях. Цяпер, аднак, пасьля зацьвярджэньня галасамі ППС бюджэту фашысцкага ўраду, пасьля апошняга галасаваньня ўсёй апазыцыі разам з ББ супроць прапановы камуністычнай фракцыі аб вотуме недавер'я ўраду Бартэля, вы, паны, дагаварыліся і ў гэтай справе. Пастанова адміністрацыйнай камісіі, ухваленая аднагалосна, г. зн., як галасамі паслоў ППС, Вызваленьня і г. д., так і ББ, гаворыць ужо не аб скасаваньні бяспрыкладнага фашысцкага абежніка, а аб няправільным тлумачэньні дастасаваньні і просіць міністра выдаць распараджэньне аб зьмене гэтага становішча рэчаў.

Такім чынам, бутарка ідзе аб дастасаваньні гэтага абежніка - намордніка **выключна ў адносінах сходаў паслоў рэвалюцыйнай рабоча - сялянскай лявіцы, г. зн., каб толькі гэтыя сходы дапускаліся з дазволу адміністрацыйных улад, каб гэтыя сходы разганяліся ўзброенай сілай фашысцкай паліцыі.** Вы дамагаецеся такога дастасаваньні абежніка, каб вашы сходы былі акружаны рознастайнай апекай з боку улад і дапамогаю паліцыі супроць «буйтуючых» мас. Вы хочаце таксама ўстанаўленьня больш цеснага супрацоўніцтва вашых сацыял - фашысцкіх баёвак з фашысцкай паліцыяй для разгону сходаў рэвалюцыйных паслоў, для «ўсьмірэньня» незадаволеньня вашых выбаршчыкаў.

Аб усім гэтым ясна, як на далоні, гаворыць пастанова камісіі. Гэта пастанова дойдзе да ведама шырокіх беларускіх, украінскіх і польскіх мас, адкрые вочы тым, хто да гэтага часу не раскусіў вашага ашуканства, хто на ўступіў яшчэ на шлях рашучага змаганьня супроць фашысцкай дыктатуры і супроць яе ўсіх сацыял - фашысцкіх і нацыянал - фашысцкіх агентаў.

На нашых «дзікіх палёх», на землях Зах. Беларусі, а таксама на землях украінскага Палесься і Валыні скліканьне сходаў да гэтага часу робіцца на падставе распараджэньня камісара ўсходніх зямель Асмалоўскага, якое зьяўляецца абавязковым яшчэ з часоў польска - савецкай вайны. У змаганьні з вызваленчым рухам беларускіх і украінскіх мас, адміністратар - сатрап мае ў нас магчымасьць выбіраць: або стары ваенны загад, або фашысцкі абежнік. Мы-ж, маючы перад сабою два шляхі: або нічога не рабіць і жыць у міры з законам, або ісьці на сходы, ня гледзячы на тое, што на гэта няма дазволу, і выканаць свой абавязак перад выбаршчыкамі — мы абралі другі шлях. Але кожная наша спроба канчалася тым, што **паслоў зьбівалі, у іх нават стралялі. 1-га мая мінулага году быў зьверскі зьбіты і паранены пасол Дварчнін; 12 ліпеня мінулага году паліцэйскі Іосіф Паплаўскі, пераапрануты ў цывільнае адзеньне, страляў у пасла Крынчыка ў галаву і толькі выпадкова пасол Крынчык ня быў забіты, а толькі лёгка паранены. Потым пасол Грэцкі два разы быў паранены паліцэйскім кастэтам у твар. На падставе распараджэньня Асмалоўскага не дазваляюць зьбірацца нават 10 асобам для арганізацыі каапэратыву або асьветнага гуртку.** Вось якія сходы лічацца ўладамі, як «нелегальныя».

Беларускі сялянска - рабочы клюб, як і клюб сельроду, ня мае ў сойме свайго памяшканьня. Мы ня маем дзе паставіць сваю канцылярыю, у часе перапынкаў мы вымушаны сланяцца па калідорах. Ня раз мы зварачаліся да маршалка сойму з просьбай даць нам які-небудзь куток у гэтым вялікім будынку, які пагнуў столькі сум, спалучаных крывавым шляхам з сялян і рабочых, і аднак, у гэтым вялікім будынку мы ня маем кутка для свайго клюбу і таму вымушаны былі арганізаваць наш сакратарыят у Вільні.

І вось, у гэтым нашым памяшканьні 25 жніўня 1929 г. адбывалася пасяджэньне беларускага сялянска - рабочага клюбу з удзелам 10 паватовых сакратароў. У часе гэтага пасяджэньня ў памяшканьне ўскочыла паліцыя з ваднамісарам сьледчай паліцыі Васілеўскім на чале, арыштавала ўсіх сакратароў, зрабіла вобыск у памяшканьні клюбу, разбурыла памяшканьне і забрала ўсе паперы. Пасьля таго, як гэтыя сакратары былі затрыманы на 2 тыдні па пазнарэднім арышце — ня гледзячы на заяўленьне пракурора, што ён не знаходзіць падстаў для прад'яўленьня ім абвінавачаньня — **гарадзкі староста налажыў на гэтых сакратароў у адміністрацыйным парадку арышт па 2 месяцы. Тэрміновае запытаньне нашага клюбу па гэтай справе было вамі, паны, адхілена.**

Гэты самы Васілеўскі, прадстаўлены за паказаны гвалт на пасаду камісара, зрабіў 30 студзеня гэтага году новы напад на наш сакратарыят, арыштаваў пэрсанал і разбурыў усё памяшканьне. **Два работнікі клюбу — няпоўналетнія юнакі, былі закаваны ў кайданы і кінуты ў турэмнае зьняволеньне.**

Адначасова ў вязку з гэтым нападам, **паліцыя зрабіла масавыя арышты на тэрыторыі ўсёй Зах. Беларусі. Былі закрыты ўсе нашы сакратарыяты ў правінцыі, а сакратары арыштаваны. Арыштаваныя мучылі і катавалі барбарскім спосабам, зрывалі у іх з пальцаў пазногці і г. д.** (галасы: казкі). Ня казкі! **У Слоніме былі арыштаваны сяляне Лябецкі і Мазол, якіх катавалі і білі гумовымі палкамі, ім улівалі ваду ў рот і нос і зьдзіралі пазногці** (воклічы).

15-га лютага ў Львове адбываўся скліканы легальна 2-гі кангрэс партыі Сельроб. Пасьля прывітаньня, зробленага тав. паслом Грэцкім з беларускага сялянска - рабочага клюбу, прысутны ў залі прадстаўнік гарадзкога староства распусьціў кангрэс, а ўзброеная паліцыя, ускочыўшая ў залю, выканала гэты загад такім чынам, што, **трымаючы вінтоўкі за рулі, з усёй сілы пачала біць прыкладамі па галавах. Сам камэндант паліцыі, стоячы на сцэне тэатру, біў людзей ботамі ў твар.**

Апрача таго, паліцыя расстаўленая на сходнях ад другога паверху да выхаду, увесь час біла прыкладамі сходзіўшых уніз удзельнікаў кангрэсу, прычым былі зьбіты паслы Хам і Сянюк, скрываўлена і паранена шмат людзей.

А вось яшчэ сьвежы факт, які сьведчыць аб «апецы» паліцэйскіх улад над беларускімі сялянска - рабочымі пасламі. Як вядома, у Сандамірскай акрузе нядаўна праводзілася кампанія паўторных выбараў у сойм. У часе гэтай кампаніі каля 50 паслоў розных згодніцкіх партый арганізавалі ў гэтай акрузе прадвыбарныя сходы — пры яўным падтрыманьні з боку паліцыі. А адначасова, калі 19 лютага гэтага году паслы т. т. Дварчанін і Грэцкі прыехалі ў гор. Завіхоста, Сандамірскага раёну, для арганізацыі сходу, дык, ня гледзячы на т

Чарговыя задачы калектывізацыі сельскае гаспадаркі і засеўнай кампаніі

Прамова сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГЕЯ на сходзе менскага гарадзкога партактыву*)

Перш за ўсё некалькі лічбаў, якія малююць фактычны ход калектывізацыі ў БССР. Яшчэ 1 кастрычніка 1929 году процант калектывізаванай плошчы складаў 3,83; да 1 студзеня гэты процант вырас да 23,15; 1-га лютага мы мелі 46,9 проц. калектывізаванай плошчы. Ближэйшая дзесяцідзёўка на 10 лютага прыносіць павялічэньне на 13 проц.; 20-га лютага процант калектывізаванай плошчы ўзьнімаецца да 65, што складае 6 проц. за дзесяцідзёўку.

З гэтага моманту далейшы рост калгасаў прыпыняецца; зводка на 1 сакавіка паказвае 66 проц. калектывізаванай плошчы, г. зн. прырост за 10 дзён усяго на 1 проц.; зводка на 10 сакавіка паказвае ўжо некаторае зьніжэньне процанту калектывізацыі—да 65,4 проц.

Некаторыя прабуюць прадставіць справу так, што гэтае прыпыненьне ў далейшым разьвіцьці калгаснага руху выклікана зьяўленьнем артыкулу Сталіна. Простае супастаўленьне фактычных даных паказвае ўсю няправільнасьць гэтае думкі. Артыкул т. Сталіна быў апублікаваны 2 сакавіка ў той час, як прыпыненьне разьвіцьця калгасаў, выхады з іх пачаліся ўжо ў 2-й палове лютага.

Сапраўдных прычын цяжкага моманту, які перажывае калгасны рух, трэба шукаць у тых перагібах, скажэньнях і скрыўленьнях партыйнай лініі, якія ішлі побач з будаўніцтвам калгасаў. Артыкул т. Сталіна і пастанова ЦК УсеКП(б) ад 10 сакавіка былі адказам на гэтыя перагібы і скажэньні партыйнай лініі. Часьцей за ўсё парушаўся прынцып добраахвотнасьці пры арганізацыі калгасаў. Гэтае парушэньне прынцыпу добраахвотнасьці, прымус пры стварэньні калгасаў—набывалі самыя розгастайныя формы; праяўляючыся часамі ў выглядзе пагроз высылаць на Салаўкі, Сібір і г. д. у адносінах да тых сялян, якія не ўваходзілі ў калгас.

Гэтым, аднак, справа не абмяжоўвалася. У некаторых мясцох праводзілася абагульненьне насельня ў сялян, якія не ўвайшлі ў калгас. Само сабою зразумела, што гэтае абагульненьне дасягалася шляхам прымусу. У Лельчыцкім раёне, Мазырскай акрузе, быў выданы загад абагуліць нават будынкі сялян, якія не ўвайшлі ў калгас. Былі выпадкі яшчэ больш грубага і простага націску і прымусу, сялян, што выступалі на сходах супроць калектывізацыі, проста арыштоўвалі ўвечары таго-ж дня і даставілі ў органы АДПУ. Арыштаваньня па сваім сацыяльным становішчы зьяўляліся сераднякамі і беднякамі. Зразумела, органы ДПУ неадкладна вызвалялі арыштаваных. Гэта форма скажэньня, на жаль, ужывалася нават асобнымі рабочымі брыгадамі. Яна, што калгасы, створаныя з ужываньнем такіх мэтадаў прымусу, заставаліся і застаюцца паперовымі калгасамі, ініцыятыва і самадзейнасьць насельніцтва, аб якіх пішацца ў нашых рэзалюцыях, былі забыты. Калгасы, выкліканыя такім спосабам да жыцьця, надзвычай тура мацнеюць адагульненьне сродкаў вытворчасьці. Такім чынам, у некаторых раёнах мы ня здолелі ўнікнуць тэй небясьпекі гульні ў калектывізацыю, супроць якое папярэджваў ЦК УсеКП(б) і якая вылілася ў пагоню за процантамі.

Рад далейшых памылак выцякае, уласна кажучы, з парушэньня таго-ж прынцыпу добраахвотнасьці. Сюды адносіцца ў першую чаргу імкненьне абагуліць усё і ўся аж да дробнае скаціны, аж да хатняй птушкі. Замест таго, каб сканцэнтраваць работу ў калгасе на абагульненьне асноўных сродкаў вытворчасьці, рабочае скаціны, таварнай прадукцыйнай часткі рагатае скаціны, с.-г. машын і прылад—замест гэтага даваліся распараджэньні аб абагульненьні жылых пабудоў, хатняй птушкі і г. д. На жаль, у гэтых адносінах паграшыў і сёй-той з работнікаў нашых цэнтральных устаноў і арганізацый (Белкалгасцэнтр—цыркуляр аб абагульненьні хатняй птушкі).

Да рэчы сказаць, імкненьне абагуліць дробную скаціну, курыцу, усіх кароў да апошняй асабліва блізка закранала жаночую частку вёскі. З-за цемры, адсталасьці жанчын, апошнія цяжэй за ўсё паддаюцца перакананьню ў перавагах калектыўнае гаспадаркі, аказваюць больш моцнае супраціўленьне справе калектывізацыі. Няправільная пастаноўка пытаньня з абагульненьнем скаціны нэрвавала асабліва моцна жаночую частку вёскі, на руках якое знаходзіцца карова, авечка, сьвіньня, хатняя птушка і, зразумела, павялічвала супраціўленьне справе калектывізацыі ў шмат раз.

Былі зроблены памылкі і ў адносінах гандлю на рынках, у паасобных мясцох закрываліся рынкі, спыняўся гандаль, як быццам-бы мы ўжо адным росчаркам пяра ўстанавілі поўны сацыялізм і плянавае разьмеркаваньне ўсіх прадуктаў, як быццам-бы не засталося зусім на вёсцы ніякае індывідуальнае гаспадаркі, якая магла-б выкінуць свае прадукты на гарадзкі рынак. Нават Наркам. Аховы Здароўя, ужо па што, здавалася-б, наркамат, якога ніхто не цягнуў уменшваць у справу рэгуляваньня гандлем, нават Наркам. Аховы Здароўя выдаў цыркуляр, які забараняў продаж мяса з разоў, г. зн. фактычна пазбаўляючы магчымасьці селяніна прывезьці на продаж у горад нават курыцу.

Былі памылкі і перагібы ў царкоўнай палітыцы. Хваля закрыцьця цэркваў арганічна зьвязана са шпаркім ростам калгаснага руху. Царква, цясьнейшым спосабам зьвязаная з кулацтвам, з буржуазіяй, з нашымі клясавымі ворагамі, зьяўляецца ідэйнай зброяй у іх руках для змаганьня супроць рабочае клясы.

Шпаркае разгортваньне калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, не магло не адбіцца на становішчы царквы. Узьнялася хваля прыгавараў аб закрыцьці цэркваў. Гэты рух здаровы і натуральны, і партыя яго ўсяк падтрымлівае, але і ў гэтай справе быў дапушчан рад перагібаў і скажэньняў. Ня рэдкія выпадкі, калі закрыцьцё тэй ці іншай царквы апіраецца не на растлумачальную работу сярод насельніцтва і не на добраахвотнае жаданьне сапраўды шырокіх пластоў бядняцкага і серадняцкага сялянства закрыць царкву, а на жаданьне невялікай жменькі камуністых і камсамольцаў данай вёскі, якія проста закрываюць царкву, выклікаючы крыўду і часамі азлабленьне ў паасобных пластох насельніцтва.

Артыкул тав. Сталіна і пастанова ЦК партыі ад 10 сакавіка зьявіліся адказам на ўсе гэтыя скажэньні партыйнай лініі. Артыкул т. Сталіна выразна і ясна паставіў два асноўныя пытаньні: папершае, што «пельга насаджаць калгасы сілай, гэта было-б недарэчна і рэакцыйна. Посьнехі нашай калгаснай палітыкі тлумачацца, між іншым, тым, што яна (гэта палітыка) апіраецца на добраахвотнасьць калгаснага руху». Падругое, што «асноўнай формай калгаснага будаўніцтва, пераважаючай формай зьяўляецца сельскагаспадарчая арцель».

Гэтыя думкі ня новыя, яны ёсьць у радзе ўстановак і пастаноў партыі за папярэднія месяцы і годы. Практыка будаўніцтва калгасаў у цэлым радзе месц пайшла, аднак, так далёка ад гэтых установак, што артыкул т. Сталіна ў некаторых мясцох прышоўся, як удар абухом на галаве.

Былі выпадкі, калі артыкул т. Сталіна хавалі і ўтойвалі ад сялян, забараняючы папярэдняе газэт, якія надрукавалі гэты артыкул. Зразумела, артыкул знаходзіў сваю дарогу ў сялянскія масы. Нумары «Правды» ад 2 сакавіка прадаваліся ў некаторых мясцох па 3-5 рублёў.

Спробы схаваць гэты артыкул сьведчаць, аднак, аб тым сумбуры, які ёсьць у галовах накатораых членаў партыі. Часьцей за ўсё гэты сумбур выяўляецца ў тым поглядзе, што артыкул тав. Сталіна разглядаюць, як адступленьне. Пытаемся—адступленьне ад чаго, ад якіх прынцыпаў? Ад якіх пазыцый адмаўляецца партыя ў артыкуле т. Сталіна? Тлумачыць артыкул т. Сталіна і пастанову ЦК УсеКП(б), як адступленьне ад узятага намі курсу на сацыялістычную перабудову вёскі, зусім антыпартыйна. Партыя ў артыкуле тав. Сталіна, у пастанове ЦК УсеКП(б) не адмаўляецца і не зьмяняе пастаноўку задач аб сацыялістычным перабудаваньні вёскі. Калі вы памятаеце, артыкул т. Сталіна пачынаецца з таго, што посьпехі калгаснага руху дасягнулі разьмераў, якія даюць магчымасьць лічыць яго моцна стаячым на ногах.

Мы за разьвіцьцё калгаснага руху, за яго ўмацаваньне, за ўсякае яго падтрыманьне. Партыя ў артыкуле т. Сталіна і ў пастановах ЦК ставіць пытаньне аб тых памылках, галавацяцтве і скажэньнях, якія ішлі побач з калгасным рухам. Не адступленьне, а выпраўленьне памылак, змаганьне супроць галавацяцтва і скажэньняў і тым самым пастаноўка ўсяе справы калгаснага будаўніцтва на больш здаровую і моцную базу. Тыя, хто тлумачыць артыкул т. Сталіна, як адступленьне, робяць палітычна шкодную антыпартыйную справу, скажаюць лінію партыі, бо яны стараюцца прадставіць справу такім чынам, што вось тыя скажэньні, гвалты і пацёк, якія ішлі побач з калектывізацыяй, прадстаўляюць з сябе сапраўдную лінію партыі, а тое змаганьне супроць скажэньняў, якое адкрывае ЦК партыі, зьяўляецца адступленьнем, здачай пазыцый і г. д.

У Магілеўскай акрузе, Шклоўскі райком партыі ўхваліў нават спэцыяльную пастанову, у якой заявіў аб сваёй нязгодзе з артыкулам т. Сталіна. Гэта паказвае, што нават цэлыя раённыя арганізацыі імкнуцца ўзвесьці ў правіла галавацяцтва і прымус у справе стварэньня калгасаў, і тармозяць, перашкаджаюць і супраціўляюцца выпраўленьню гэтых скажэньняў. Такіх работнікаў трэба зьнімаць, такія арганізацыі трэба распускаць.

Партыя заўсёды ставіла пытаньне аб разьвіцьці калгаснага руху на асновe добраахвотнасьці, на аснове самадзейнасьці і ініцыятывы.

Пастановы XVI Усесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі гаворыць, напрыклад, «што найбольш паказальным фактам, які дэманструе ўсю жыцьцёвасьць калгаснага руху, зьяўляецца тое, што калгасы растуць на аснове самадзейнасьці і ініцыятывы, якія ідуць зьнізу, з самых сялянскіх мас, што перавага буйнае гаспадаркі ўжо знаходзіць сваё адлюстраваньне ў калгасах».

У другім месцы гэта-ж пастанова таворыць пра тое, што: «посьпехі калгаснага руху забясьпечваюцца сьвядомасьцю, актыўнасьцю, ініцыятыўнасьцю саміх членаў калгасу».

Пастановы ЦК УсеКП(б) ад 6 студзеня 1930 г. папярэджваюць супроць небясьпекі двух перагібаў у справе калектывізацыі: папершае, супроць тых, хто тармозіць разьвіцьцё калгаснага руху спасылкаю на недахват трактараў, машын або пад іншымі прычынамі; падругое, супроць тых, хто гоніцца за папяровымі дасягненьнямі, дутымі процантамі, і пераварае сур'ёзную справу калектывізацыі ў гульню ў калектывізацыю.

Гэтыя-ж установкі мы знаходзім у пастанове студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б. Рэзалюцыя студзеньскага пленуму папярэджвае таксама супроць бюракратычнага падыходу і адміністраваньня пры арганізацыі калгасаў і падкрэсьлівае задачу ўзьняцьця і арганізацыі самадзейнасьці і ініцыятывы ў справе калгаснага будаўніцтва.

На першыя весткі аб арышце сераднякоў і беднякоў за адмаўленьне ісьці ў калгас ЦК рэагаваў тэлеграмай, у якой патрабаваў паведаміць дакладныя весткі аб парушэньнях партыйных дырэктыў і аб ужытых акруговых камітэтамі мерах у сувязі з гэтымі парушэньнямі.

У лісьце аб раскулачваньні 6 лютага ЦК КП(б)Б піша аб сапраўдным масавым калгасным руху беднаты і серадняка сялянства і рашуча папярэджвае супроць таго, каб мерапрыемствы, накіраваныя на раскулачваньне кулакоў, не закранялі серадняцкіх гаспадарак.

У апошнім сваёй пастанове аб ходзе калектывізацыі, апублікаванай адначасова з апублікаваньнем артыкулу т. Сталіна і прыкладным статутам сельска-гаспадарчай арцелі, ЦК КП(б)Б з яшчэ большай настойлівасьцю перасьцерагае супроць адміністраваньня ў справе калгаснага будаўніцтва.

Зараз пасьля зьяўленьня артыкулу т. Сталіна некаторыя таварышы, ілкаючы, відавочна, згоду з лініяй партыі, заяўляючы на словах аб гатоўнасьці выправіць памылкі і перагібы, адначасова ставяць пытаньне аб цэнтры і месцох. «Вы, цэнтравікі, усё звальваеце на месцовых работнікаў, прымушаеце іх адных адказваць за ўсе зробленыя памылкі». Такая пастаноўка, зразумела, няправільная. Яна змазвае палітычны сэнс пытаньня аб перагібах і скажэньнях, аб іх карэньнях і пахаджэньні і замяняе гэта пытаньне месьніцкімі спрэчкамі «вы і мы, цэнтр і месцы».

З вышэй вылажанага ясна, што ня толькі на мясцох мы маем скажэньні і перагібы партыйнай лініі; у паасобных рэспубліканскіх установах і арганізацыях, у паасобных рэспубліканскіх і акруговых работнікаў можна таксама назіраць паасобныя перагібы і скажэньні.

У паасобных зьвеньнях нашай партыі, у пэўнай часткі членаў партыі, незалежна ад таго, ці працуюць яны на мясцох ці ў цэнтры, у акрузе ці раёне, ці ў рэспубліканскіх установах—лінія партыі на разьвіцьцё калгаснага руху праламлялася так, што справа даходзіла да прышыбееўскіх мэтадаў, да простага самадурства. Часам грабуюць у апраўданьне гэтых памылак і скажэньняў спасылаца на адзін радок у пастанове студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б. Гэты радок гаворыць: «Даручыць Наркамзему і Калтасцэнтру тэрмінова распрацаваць статут с.-г. арцелі з тым, каб максымальна забясьпечыць пераход ад с.-г. арцелі да камуны, прадугледзеўшы пры гэтым недапушчальнасьць прыёму кулакоў у калгас».

Гэта пастанова студзеньскага пленуму не дае, аднак, ні ценю падставы парушаць прынцып добраахвотнасьці ў калгасным будаўніцтве. **Іменна парушэньне прынцыпу добраахвотнасьці зьяўляецца асноўным грахом, асноўнай памылкай, галоўным скажэньнем у справе будаўніцтва калгасу.**

Мы і зараз выказваемся за пераход ад сельска-гаспадарчай арцелі да камуны там, дзе гэты пераход падрыхтаваны сапраўды сур'ёзнай работай, там, дзе гэты пераход адбываецца сапраўды добраахвотна па ходзе членаў арцелі. Мы і зараз за тое, каб аддаць перавагу больш высокім формам калгаснага руху, паранальна з больш нізкімі, што прадугледжана і ў пастановах 16 Усесаюзнай партканфэрэнцыі, якія гаворыць: «умацаваць работу на абагульненьні вытворчых працэсаў у таварыства на супольнай апрацоўцы зямлі, аб мяжоўваючыя мерамі фінансава-матар'яльнай і арганізацыйнай дапамогі да іх пераходу у вышэйшыя формы калгаснага руху (арцелі і камуны)».

Мы і зараз там, дзе насельніцтва само добраахвотна згодна абагуліць усе сродкі вытворчасьці, падтрымаем іх у гэтым намеры. Мы не дазволім камунебудзь хаваюча за гэту пастанову студзеньскага пленуму ў апраўданьне дапушчаных перагібаў і скажэньняў. Аднак, прымаючы пад увагу, што быў дапушчан рад памылак насьпешнага неўгрунтаванага пераводу арцеляй у камуны, мы папярэджваем нашу партарганізацыю супроць магчымасьці падобнага роду памылак.

Часамі ставяць пытаньне, хто вінаваты? Я думаю, што, калі гаварыць аб персанальнай адказнасьці, дык мы павінны будзем у адносінах да кожнага паасобнага выпадку перагібаў, скажэньняў і памылак падыйсьці індывідуальна, каб пакараць і заклікаць да парадку тых, хто груба скажаў партыйную лінію. Мы ня спынімся нават перад выключэньнем з партыі ў адносінах да тых, хто будзе абараняць памылкі і заблуджэньні дзеля таго, каб дабіцца рэакта і рашучага пералому ў арганізацыі, дзеля таго, каб арыентаваць усю нашу партыйную арганізацыю на выпраўленьне памылак.

Значна больш сур'ёзным пытаньнем зьяўляецца пытаньне аб карэньнях гэтых памылак і скажэньняў. Гэтыя карэньні закладзены ў дробна-буржуазнасьці, у непралетарскім дробна-буржуазным асяродзішчы, якое акружае нашу партыю і часткова праскакае ў яе рады.

Паасобныя зьвеньні нашай партыі, паддаўшыся дробна-буржуазнаму ціску, ня выявілі сур'ёзнага дзелавога бальшавіцкага падыходу да справы калектывізацыі.

Спачатку настроі «шапкамі закідаем, нам усё ні па чым, мы ўсё можам». Потым, калі партыя паставіла пытаньне аб выпраўленьні памылак, настроі папікі, зьбянтэжанасьці «усё загінула, усё рассыпаецца, нам ня ўтрымаць калгасаў». Там, дзе больш было перагібаў, дзе больш было скажэньняў, дзе мацней зарваліся, там больш зьбянтэжанасьці, больш гаворак аб адступленьні. Гэтыя настроі характэрны іменна для небальшавіцкага, непралетарскага асяродзішча, для дробна-буржуазных элемэнтаў.

З падворнага выгляду ўсе гэтыя памылкі і скажэньні як быццам ня посяць апартуністычнага характару. Я пэўнены, што сёй-той, у глыбіні душы, супакойваў сябе: «у правым ухіле мяне ва ўсякім выпадку нельга будзе абвінаваціць».

Гэты разьлік не апраўдаўся. У адносінах да тых, хто дапускаў скажэньні, мы даем палітычную ацэнку гэтым памылкам, як памылкам апартуністычным па існасьці. Па сутнасьці справы гэтыя памылкі тармозяць калгаснае будаўніцтва і гэтым самым льлюць ваду на млын правага апартунізму.

Правыя апартуністыя пярэчылі супроць шпаркага разьвіцьця калгаснага будаўніцтва, партыя ўступіла на шлях гэтага будаўніцтва. Дробна-буржуазны элемэнт, які дапусьціў перагібы і скажэньні, фактычна дабіўся таго, чаго хацелі правыя апартуністыя, яны затармазілі разьвіцьцё калгасаў. Але ня толькі вынікі абодных радоў памылак—адкрыта правых і загібаў, якія здаюцца «левымі», зьяўляюцца адлюстраваньнямі,—агульныя і карэньні гэтых памылак. З аднаго боку, правы апартунізм найбольш выразна праяўляецца ў вясковай рабоце, у недаацэнцы ролі батрацтва і беднаты, нагарджаньні работай з батрацтвам і беднатой, у забыцьці гэтай работы, у адсутнасьці сувязі з батрацтвам, беднатой і іх арганізацыяй.

З другога боку, там, дзе было больш за ўсё скажэньняў і «левых» загібаў, там горш за ўсё стаіць справа іменна з арганізацыяй батрацтва і беднаты. Яно і зразумела. Той, хто не працаваў з батрацтвам і беднатой, хто ня меў здаровай апоры ў найбольш блізкіх нам пластох вёскі, той, імкнучыся схаваць свае апартуністычныя вупы, найбольш часта ўжываў адміністраваньне і прымус у справе будаўніцтва калгасаў.

Справа калектывізацыі праходзіць на ўмовах завостранага клясавага змаганьня. І было-б няправільна і зусім падзіўнае думаць, што калі мы кулакоў раскулачылі, калі мы выслалі некалькі сотень кулацкіх сем'яў за межы нашае акругі, дык кулацтва, як клясавы вораг, можа быць зьнята з парадку нашай работы. Рэчаіснасьць паказвае, што кулак, які раскулачаны і знаходзіцца пад пагрозай высылкі, адчувае сябе ў стане чалавека, якому больш губляць няма чаго і таму ён выступае супроць калектывізацыі з асаблівай сілай. Ён скарыстоўвае кожную нашу палай. Ён скарыстоўвае кожную нашу палай, кожны наш промах для таго, мыльку, кожны наш промах для таго, каб уклініцца ў нашу работу і алакаб уклініцца ў нашу работу і алакаб ад нашага ўплыву паасобныя рвацьць пласты сялянства. Зразумела, нам трэба мацней арганізаваць батрацтва і бедноту. Бяднацка-батрацкія групы ў калгасах амаль яшчэ ня створаны, а там, дзе яны створаны, работа іх яшчэ не дае яны створаны, работа іх яшчэ не дае яны створаны, работа іх яшчэ не дае яны створаны, што калгасы можам быць уцэўненымі, што калгасы будуць моцнымі арганізацыямі.

Якое-ж становішча мы маем на даным этапе калгаснага будаўніцтва? Я ным этапе калгаснага будаўніцтва? Я ным этапе калгаснага будаўніцтва? Я

На барацьбу за прамфінплян

Прамфінплян з курсам на... зьніжэньне

Што выявіла рабочая брыгада на менскім хлебазаводзе

Рабочая брыгада заводу «Дрэваапрацоўшчыкаў» у складзе 5-ці таварышоў—Ліўшыца, Шапіры, Савіча, Літвінскага і Модлін—абсьледвала выкананьне прамфінпляну на Менскім хлебазаводзе.

Вынікі абсьледваньня кажуць аб тым, што адміністрацыя заводу і заводзкія арганізацыі, карыстаючыся тым, што завод зьяўляецца самастойнай адзінкай і яго прамфінплян не ўваходзіць у агульны прамфінплян нашай прамысловасьці, вызначылі свой прамфінплян, выходзячы **не з патрэбнага росту работы заводу, а цягліся ў хвасьце адсталых настроеў і ня улічылі сапраўдных магчымасьцяй заводу.**

Напрыклад, у галіне **прадукцыйнасьці** прамфінплян на першы квартал вызначыў ня толькі павялічэньня, але нават **памяншэньне** ў параўнаньні з мінулым кварталам **на 11,34 проц.** Чамусь-ці была ўзята лічба ў 123 цэнтн. хлеба для хлебнага цэху за 8-мігадзінны рабочы дзень, ня гледзячы на тое, што гэтая лічба была выканана цэхам **яшчэ ў маі мінулага году,** а на працягу мая-кастрычніка выпрацоўка павялічылася **да 137,21 цэнтн.** Выходзячы з апошняй лічбы росту прадукцыйнасьці, а таксама улічваючы разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва і далейшы рост кваліфікацыі рабочых, трэба было адміністрацыі заводу запраектаваць павялічэньне прадукцыйнасьці працы **хаця-б на 10 проц.,** што дало-б каля 151 цэнтн. хлеба ў дзень.

Жыцьцё паказала, што такі падыход быў-бы зусім правільным. Першы квартал даў **146,24** цэнтн. у дзень, гэта значыць больш складзенага адміністрацыяй пляну **на 18,9 проц.** Але адміністрацыя, як паказана вышэй, вызначыла толькі 123 цэнт. і такім чынам значнае перавыкананьне гэтага «пляну» дало магчымасьць адміністрацыі на ўсіх пасяджаньнях «казырыць» вялікімі «дасягненьнямі». Між тым, па самых скромных падліках хлебны цэх павінен быў даць на 3 проц. больш таго, што ён даў, г. зн., што вытворчая праграма па хлебным цэху **ня выконвалася штодзенна на 3 проц.**

Лічбы гэтых «дасягненьняў» друкаваліся ва ўсіх мясцовых газэтах, прыводзіліся ў розных зводках і толькі ўводзілі ў зман грамадзкую думку і кіраўнічыя арганізацыі. Пры чым партыйная і парфэсыянальныя арганізацыі заводу, з прычыны казённага падыходу да гэтай справы, штомэпэлявалі лічбы адміністрацыі, нават не абагорваючы іх.

Бюракратычныя адносіны выказала і **плянавае аддзяленьне МЦРК,** якое зацьвердзіла прамфінплян, як відаць, не азнаёміўшыся з ім.

У сувязі з тым, што прамфінплян першага кварталу быў **штучна зьменшаны,** выканаць яго было справай **ня вельмі цяжкай.** Таму рабочая грамадзкасьць на заводзе ня была мабілізавана на барацьбу з усімі недахопамі ў цэхах. Заводзкія арганізацыі не знайшлі патрэбным выкарыстаць энтузіязм рабочых, якія ўступілі ў сацспаборніцтва з радам іншых заводаў і каб дабіцца лепшых вынікаў, добраахвотна павысілі нормы выпрацоўкі—па хлебным цэху на 10 проц., бараначным—на 20 проц. і булачным—на 40 проц., у выніку чаго кошт рабочай сілы зьменшыўся на 29 проц. Але той факт, што нават і пасьля добраахвотнага павышэньня норм рабочыя маюць прыработак у сярэднім **каля 60 проц.,** паказвае, што справай нармаваньня працы на заводзе зусім не займаюцца.

Поўны спакой за лёс прамфінпляну, упэўненасьць у тым, што ён будзе выканаваны (ды і чаму яго ня выканаць, калі ён у самым пачатку ўжо быў значна перавыкананы?), не выклікалі неабходнасьці ў заводзкіх арганізацый цікавіцца становішчам сацспаборніцтва і ўдарным рухам на заводзе. Таму, за першы квартал колькасьць прагулаў павялічылася да 20 дзён замест 15 дзён да сацспаборніцтва. Праверка сацспаборніцтва паміж асобнымі рабочымі майстрамі і брыгадамі адсутнічала. Ня было праверкі сацспаборніцтва і паміж заводамі—Менскім, Магілеўскім і Ленінградзкім, якія падпісалі паміж сабою сацдагавор. Між тым, па сацдагаворы хлебазавод абавязаўся павялічыць выпрацоўку супроць пляну на 15 проц., Фактычна-ж сацдагавор **недавыкананы на 9 проц.**

Такое-жа становішча з выдаткаваньнем апалу. Першы квартал даў павялічэньне выдатку апалу на 26,16 проц. на цэнтнэр хлеба ў параўнаньні з плянам, а ў параўнаньні з лічбай, вызначанай сацдагаворам, нават на 36 проц. Страты ад браку таксама павялічыліся.

І вось, ня гледзячы на неадпаведнасьць пляну да фактычных магчымасьцяй заводу, у другім квартале зноў **паўтараецца тое самае.** Прадукцыйнасьць працы на хлебным цэху запраектавана **ў 140 цэнтн.,** ня гледзячы на тое, што фактычна **ўжо першы квартал даў выпрацоўку ў разьмеры 146,24 цэнтн. у дзень.** Тлумачыць гэта выпадковай памылкай нельга. Гэта лічба выразна кажа аб тым, што адміністрацыя, пры маўклівым патураньні заводзкіх арганізацый, **змазвае значэньне прамфінпляну** і ня ставіць сабе мэтай дабіцца лепшых вынікаў работы заводу, ня гледзячы на ўсе магчымасьці.

Такія адносіны да вытворчасьці трэба рашуча асудзіць.

Д.

НЕАДКЛАДНА ВЫРАШЫЦЬ

Даць магчымасьць Барысаўскаму камбінату пачаць работу ў вызначаны тэрмін

У «Зьвязьдзе» № 66, у артыкуле—«Галавацяцтва, якое мяжуецца са шкодніцтвам»—мы ўжо адзначалі напружанае становішча на Барысаўскім камбінаце, яго ўсіх бакоў, з прычыны адсутнасьці катлоў, можа зацягнуцца.

Учора мы атрымалі ліст вытворчай нарады заводу імя «Камінтэрн», на тэрыторыі якога пабудаваны камбінат, з просьбай прыняць рашучыя меры да вырашэньня пытаньня аб бліжэйшым лёсе камбінату.

У лісьце гаворыцца, што на сёньняшні дзень на камбінаце ўжо пабудаваны мэбляві і капыловы цэхі, ужываюцца меры для пашырэньня фанэрнага цэху, што для першых двух цэхаў лстам будуць атрманы імпартныя машыны, але, з прычыны адсутнасьці кацельнай станцыі, новыя корпусы ня змогуць быць пушчаны ў ход.

Вытворчая нарада заводу «Камінтэрн» патрабуе ад кіруючых арганізацый тэрмінова выслаць на пабудову камбінату аўтарытэтную камісію інжынэраў, каб яна разам з вытворчай камісіяй канчаткова высьветліла пытаньне аб пабудове кацельнай станцыі, ужыць захады да набыцьця катлоў, неабходных для пуску камбінату ў вызначаны тэрмін, абсьледваць становішча лесапільных цэхаў і наогул расьсьледваць справу аб неўвязцы ў пабудове камбінату і кацельнай станцыі.

На запытаньне рэдакцыі ВСНХБ паведаміў, што **бліжэйшымі днямі склікаецца нарада спэцыялістых для канчатковага вырашэньня пытаньня аб камбінаце.**

ЧЫМ ТЛУМАЧЫЦЬ?

Назаўчора мы зьмясьцілі заметку брыгадзіра ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў т. т. **Карнейчыка і Кацмана** аб тым, што Мазырскі лесапільны завод «Пралетары» недзь зусім ня спыніў працу, зьніжаючы выпрацоўку прадукцыі на 70 проц. з прычыны недахопу сырцу.

Учора мы атрымалі паведамленьне Лесбелу, што заметка не адпавядае сапраўднасьці. У дзень зьмяшчэньня заметкі супрацоўнік Лесбелу званіў на завод «Пралетары» і дырэктар заводу тав. **Батвінік** адказаў, што завод **як працаваў, так і працуе бесьперабойна.** У дадатак да гэтага тав. Батвінік учора прыслаў тэлеграму наступнага зьместу: **«Пралетары ня стаў. Сырэц падаецца чыгункай. Сёньня прыбывае першы сплаў калод заводу».**

На наша запытаньне, чым-жа тлумачыць гэтыя дзьве супрацьлеглыя інфармацыі, супрацоўнік Лесбелу адказаў, што ў даным выпадку, магчыма, ёсьць жаданьне падняць фальшывую трывогу, каб паскорыць дастаўку лепшага гатунку сырцу, між тым, як завод працуе з сырцом трохі горшага гатунку, што, зразумела, нямыслімна і для заводу і для рабочых.

Рэдакцыя лічыць, што калі гэта тлумачэньне мае пад сабой пэўную падставу, **трэба востра паставіць пытаньне аб недапушчальнасьці такіх мэтадаў скарыстаньня друку для ілжывай інфармацыі.** Рэдакцыя просіць **Мазырскі акругком партыі** высьветліць, што сапраўды мела месца на заводзе «Пралетары».

РАЗГАРНУЦЬ ПРАВЕРКУ ВЫКАНАНЬНЯ САЦДАГАВАРОЎ

Што робяць прафсаюзы?

Прафсаюзы БССР пачалі падрыхтоўку да гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва. Гадавіна праводзіцца пад знакам праверкі ходу сацыялістычнага спаборніцтва на фабрыках і заводах, паміж асобнымі цэхамі, прадпрыемствамі і ўстановамі. Галоўная задача праверкі—узмацненьне і яшчэ большае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва, ліквідацыя прарываў у выкананьні прамфінпляну.

24-га сакавіка на пасяджэньні прэзыдыуму **ЦП** саюзу **хэмікаў** было пастаноўлена замацаваць членаў прэзыдыуму на прадпрыемствы для ўдзелу ў праверцы ходу сацыялістычнага спаборніцтва на месцах. Прэзыдыум ЦП выказаўся за неабходнасьць правядзеньня праверкі дагавораў ня толькі паміж прадпрыемствамі БССР, але і дагавораў, якія заключаны з прадпрыемствамі **іншых саюзных рэспублік.**

Учора два члены прэзыдыуму тав. **Крэнь і Кавалеўскі** выехалі на месцы. Тав. Крэнь выехаў на заводы «Ільліч» і «Кастрычнік». Тав. Кавалеўскі ў гуту імя Домаля і запалкавую фабрыку «Чырвоная Вярэніца» (Н.-Барысаў).

Прэзыдыум ЦП саюзу **дрэваапрацоўшчыкаў** намацдываў 5 брыгад у розныя гарады БССР для падрыхтоўкі і ўдзелу ў праверцы сацыялістычнага спаборніцтва на прадпрыемствах. Усяго выехала 10 чал. у Віцебск, Мазыр, Гомель, Бабруйск і Барысаў. Кожная брыгада складаецца з аднаго члена прэзыдыуму ЦП і аднаго-двух рабочых з мясцовых прадпрыемстваў. Брыгады будуць працаваць на прадпрыемствах на працягу 2-х тыдняў.

Побач з праверкай сацыялістычнага спаборніцтва брыгады будуць праводзіць работу па давядзеньні прамфінпляну да асобнага цэху, варштату, да кожнага рабочага.

На саюзе **харчавікоў** падрыхтоўка да гадавіны пачалася 22-га сакавіка. 26 сакавіка гэтае пытаньне стаяла на спэцыяльнай нарадзе фабзаўкомаў. Нарада пастанавіла выдучыць на ўсіх харчовых прадпрыемствах брыгады для праверкі сацыялістычнага спаборніцтва. На прадпрыемствах будуць праведзены вечары, прысьвечаныя гадавіне.

На групкоме № 1 саюзу **харчавікоў** і на хлебазаводзе будуць праведзены канфэрэнцыі ўдарнікаў, на якіх будуць падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва на прадпрыемствах.

ЦП саюзу склікае на 30 сакавіка пышную канфэрэнцыю рабочых—добраахвотнікаў на пытаньні аб праверцы сацыялістычнага спаборніцтва. Усе члены прэзыдыуму ЦП прымацоўваюцца да заводаў і фабрык для ўдзелу ў праверцы.

Вынікі праверкі будуць абагулены на чарговым пасяджэньні прэзыдыуму ЦП і па пыркоім сходзе прафактыву.

Белбюро ЦК чыгуначнікаў разаслала падрабязныя дырэктывы ўсім вучпрафсожам аб неадкладным разгортваньні падрыхтоўкі да гадавіны. Члены пленуму Белбюро ЦК прымацаваны да асобных прадпрыемстваў для правядзеньня гадавіны. Вестак з месц аб ходзе падрыхтоўкі Белбюро ЦК пакуль яшчэ не атрымала.

Не вядзецца падрыхтоўка да гадавіны па саюзах **будаўнікоў і мэталістых.** У саюзе будаўнікоў нашаму супрацоўніку заявілі:

— Мы зараз заняты актуальнымі пытаньнямі—падрыхтоўкай да будаўнічага сэзону і распрацоўкай расцэнак. Падрыхтоўкай да гадавіны мы не займаемся, бо ў нас няма часу.

Выходзіць, што праверка сацспаборніцтва не зьяўляецца актуальным пытаньнем, для гэтай работы не хапае часу. Мы лічым, што працаўнікі саюзу будаўнікоў памыляюцца. Посьпех правядзеньня будаўнічага сэзону цесна зьвязаны з ходам сацыялістычнага спаборніцтва і залежыць ад ступені разгортваньня апошняга на будаўніцтвах.

У саюзе мэталістых наш супрацоўнік атрымаў аналягічны адказ:

— Мы заняты перавыбарамі заўкомаў і не маем часу для падрыхтоўкі да гадавіны. Пасьля скаўчэньня перавыбараў мы пачнем праводзіць гэтую кампанію.

Такая пастаноўка пытаньня **нікуды ня варта.** Ні ў якім разе нельга адкладваць разгортваньне праверкі сацыялістычнага спаборніцтва. Саюз мэталістых павінен зараз-жа прыняць рашучыя меры для разгортваньня падрыхтоўкі да гадавіны.

С. Г.

Экспартныя пляны ня выкананы поўнасьцю

Замест мабілізацыі ўсіх сіл—гандлярскія спрэчкі паміж канкуруючымі арганізацыямі

Экспартны плян за першыя 5 месяцаў гасдагарчага году выкананы толькі на 75 проц., пры чым супроць мінулага году мы маем рост толькі на 20 процантаў. Гэтакае выкананьне экспарту патрабуе ад усіх арганізацый, якія займаюцца экспартам, неадкладна перабудаваць усю сваю працу з тым, каб поўнасьцю забясьпечыць выкананьне пляну.

Ніякіх аб'ектыўных прычын, якія змаглі-б апраўдаць і зьмякчыць віну арганізацый, што ня выконваюць экспартных плянаў—няма. Наадварот, мы наглядаем яўную бязьдзейнасьць, непрыстасаванасьць нашага апарату да тых павышаных тэмпаў, якія неабходны.

У рабоце па экспарце адсутнічае сацыялістычнае спаборніцтва паміж асобнымі загатоўцамі. Зусім адсутнічае штодзённы выторчыя і што яна не павінна на займацца зборам рызьзя і касьцей нават у калгасах. Гэта справа павінна быць перададзена Белдзяржгандлю, які абавязан інструктаваць калгасы і сапраўды дабіцца разгортваньня гэтай справы. Замест гэтага некаторыя акруговыя саюзы наляводчай і малочнай капэрацыі прапануюць калгасам не працаваць разам з Белдзяржгандлем, ацуюць ужо заключаныя умовы. З прычыны такой пастаноўкі пытаньня ў калгасах зусім адсутнічае работа па загатоўцы сырцу, адсутнічае кіраўніцтва як з боку Белдзяржгандлю, так і з боку капэрацыі. Такая работа асабліва адбіваецца на магчымасьці атрыманьня калгасамі трактараў за ўтыль.

Усе паказаныя недахопы павінны быць зараз-жа зьнішчаны.

Выкананьне экспартных плянаў павінна быць узята пад кантроль шырокіх рабочых мас, таксама як мы ўзялі пад кантроль выкананьне прамфінпляну. Экспартэры павінны адчуваць рабочы кантроль.

Толькі пры такіх умовах мы сапраўды забясьпечым выкананьне экспартных плянаў, як асноўнага зьвяна народна-гаспадарчага пляну.

АБРАМСОН.

Праграма капітальнага будаўніцтва павінна быць выканана

Вялізная праграма капітальнага будаўніцтва—на суму каля 160 мільёнаў рублёў — патрабуе мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў для яе пасьпяховага выкананьня.

Аднак, гэты важнейшы вучастак дагэтуль не забясьпечаны адпаведнай матар'яльна-тэхнічнай базай. Па ўсіх асноўных лініях падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону: праекты, кадры рабочай сілы, выраб будаўнічых матар'ялаў—стварылася трывожнае становішча. Ня гледзячы на рад пастаноў ЭКАНА і будаўнічага камітэту паўтараюцца памылкі мінулых гадоў—няўзгодненасьць, недагаворанасьць, цяганіна з складаньнем праектаў,—падрыхтоўка да будаўнічага сэзону праходзіць ня лепш, а нават горш, чым у мінулым годзе.

Дагэтуль адсутнічаюць праекты на пабудовы на 60 міл. руб. Падрыхтоўка праектаў аграмаджанага сэктару с.-г. праходзіць зусім дрэнна. Сустракаецца рад выпадкаў абураючага галавацяцтва, калі складаюць праект 6 паверху пабудовы пры адсутнасьці праекту першага паверху (дом ураду), калі тыя арганізацыі, якія вядуць змаганьне за лепшую падрыхтоўку да сэзону, самі на некалькі раз перарабляюць праекты вызначаных імі пабудоў (ЦП саюзу будаўнікоў, НКП). **Вельмі мала зроблена, каб выканаць дырэктывы аб зьніжэньні сабекошту будаўнічых работ.** Рацыяналізацыя, мэханізацыя работ амаль выпала з-пад увагі будаўнічых арганізацый. На рынку працы ня зьнішчан ажыятаж і нездаровая канкурэнцыя. Усё яшчэ ёсьць выпадкі пераманьвання інжынэрна-тэхнічных работнікаў і кваліфікаваных будаўнікоў. Для будаўніцтва БССР патрэбна больш за 50 тыс. сэзонных рабочых-адыходнікаў, аднак, дагэтуль праўленьні калгасаў ня выканалі дырэктывы СНК аб дапамозе адыходніцтву, не зразумелі ўсёй важнасьці выкананьня кантрольных лічбаў па вярбоўцы рабочай сілы.

Мала што зроблена, каб забясьпечыць сэзоньнікаў неабходнымі інтэрнатамі і харчаваньнем. У Барысаўскім раёне сэзоньнікам прыходзіцца хадзіць за 5 вёрст, каб атрымаць прадукты.

Некаторыя нашы будаўнічыя арганізацыі, каб зьнядць з сябе адказнасьць за нядбайнасьць за дрэнную падрыхтоўку, крычаць аб недахваце будаўнічых матар'ялаў. Аднак, яны вельмі мала зрабілі для разьмеркаваньня наяўных рэсурсаў будаўнічых матар'ялаў, для замены дэфіцытных матар'ялаў іншымі, для пашырэньня будаўнічай прамысловасьці. Мы маем рад фактаў агіднага разьмеркаваньня матар'ялаў, злачынага хаваньня іх. **Ніхто сур'ёзна ня думае пра мабілізацыю ўнутрыпрамысловых і будаўнічых рэсурсаў.** Нічога ня зроблена, каб выявіць тыя аб'екты, якія ня могуць быць пабудаваны ў гэтым годзе, каб асыгнаваныя на іх сумы і сродкі перакінуць на іншыя вучасткі.

Прафарганізацыі саюзу будаўнікоў вельмі мала зрабілі для мабілізацыі мас вакол будаўніцтва, для перамаганьня цяжкасьцяй. На гэтым вучастку гаспадарчага фронту менш за ўсё ўжываюцца формы масавага рабочага кантролю, ударніцтва, сацспаборніцтва.

Мала зрабіў для кантролю над будаўніцтвам і камітэт па справах будаўніцтва—за ўвесь год працаўнікі камітэту толькі 3 разы пабывалі ў акругах БССР.

Да пачатку будаўніцтва застанося вельмі мала часу. Трэба напружыць усе сілы, каб максымальна паскорыць складаньне і зацьвярджэньне плянавых праектаў.

І, нарэшце, трэба рэзка ўдарыць па дэмабілізацыйных, пашыўрскіх настроях некаторых гаспадарнікаў, якія сваё няўменьне працаваць, сваю керасправадчасьць імкнуцца прыкрыць («аб'ектыўнымі» прычынамі.

НЯМА ПРАЕКТАЎ ПАБУДОЎ НА 60 МЛН. РУБЛЕЎ

Становішча з забесьпячэньнем аб'ектаў капітальнага будаўніцтва ў 1929-30 годзе праектамі на сёньняшні дзень надзвычай дрэннае. Паводле далёка няпоўных вестак, будаўніцтва БССР не забясьпечана праектамі на 60 млн. руб. Паказаная сума разьмяркоўваецца па акругах такім парадкам: па Гомельскай—на 1 млн., Магілеўскай—на 867,5 тыс., Полацкай—на 828 тыс., Аршанскай—на 411 тыс., Бабруйскай—на 270 тыс., Менскай—да 50 тыс., па ВСНГ—на 3 млн. руб., Беларускай с.-г. акадэміі—на 2 млн. руб., НДІ імя Леніна—300 тыс. руб. і па аграмаджаным сэктары НКЗ—звыш 50 млн. руб. Горш за ўсё, такім чынам, справа стаіць па лініі Наркамзему. У Менскай акрузе не забясьпечаны праектамі пабудовы вяровачнай, рымарнай і трыкатажнай фабрыкі—у Менску, чарапічна-ганчарнага і крухмальнага заводаў у Барысаве і Бягомлі; Полацкай—цагельні і 2-хпавярховых будынкаў; па Магілеўскай—цагельні, пабудовы чаралічнага і кафэльнага заводаў, больніцы і пабудовы камунальнага дому; у Гомельскай—цагельні і вапнянага заводу, больніцы, дому сувязі і ясьляй—у Рэчыцы, па Аршанскай—пабудовы цагелень у Горках, Кохаве, Амсьціслаўлі і Чэрэі, чарапічнага заводу ў Горках і крухмальнага—у Дрыбіне; па Бабруйскай—пабудовы мяблявай фабрыкі, мэдычнага пункту, раённай больніцы і электрыфікацыі ў Асіпавічах, па ВСНГ—цэлюлёзнага камбінату ў Бабруйску, мэліярацыйнага цэху заводу «Мэталісты» і дому друку.

Трэба зараз-жа прыняць усе захады да таго, каб вызначаны плян будаўніцтва на 1929-30 г. быў выкананы.

М. ШЫРКО.

Бязьлітасна ўдарым па спробах кулака сарваць выхад у поле

Барацьба з перагібамі замацоўвае калгасны рух, мабілізуе бядняцка-серадняцкія масы супроць кулака

УПАРТА НЯ ХОЧУЦЬ ВЫКОНВАЦЬ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ

Партыяй даны выразныя дырэктывы безадкладна выправіць перагібы і галавацяцтвы, дапушчаныя пры арганізацыі калгасаў.

Але на мясцох некаторыя працаўнікі, якія імкнуцца ўтаіць дапушчаныя імі перагібы і палітычныя памылкі, абараняючы «гонар свайго мундзіру», упарта не жадаюць выконваць гэтых дырэктыў партыі. Яны і далей ужываюць адміністрацыйныя мэтады і пагрозы пры далейшай арганізацыі і замацаваньні калгасаў.

У Боркавіцкім раёне ў калгасе «Чырвоны Партызан» як праўленьне калгасу, так і ячэйка КП(б)Б утойваюць ад калгаснікаў новы статут с.-г. арцелі і артыкул тав. Сталіна. Калгаснікі патрабуюць ад ячэйкі азнаёміць іх з новым статутам, але ячэйка і праўленьне калгасу ігнаруюць калгаснікаў. Большасьць калгаснікаў — беднякі, былыя чырвоныя партызаны, маюць на адной карове. Але праўленьне калгасу і ячэйка КП(б)Б стаяць на сваім. Каб запалохаць калгаснікаў і прымусіць іх абагуліць усіх кароў, старшыня калгасу Жук (заможны селянін, які да ўступленьня ў калгас распрадаў сваю жывёлу, сваю карову памяняў на горшую і перадаў яе ў калгас) разам з членам праўленьня Барчуком (настаўнік - камсамолец) прапануюць спажывецкай краме выдаваць тавары толькі тым калгасьнікам, якія згодзяцца абагульваць усю жывёлу.

Калі-ж калгасьнікі адмовіліся абагульваць зараз сваіх кароў, старшыня калгасу Жук і член праўленьня Барчук накіравалі ў спажывецкую краму наступную паперку: «спыніць выдачу цукру і ўсіх прадуктаў членам калгасу «Чырвоны Партызан», тэрмінова і строга.



Старшыня калгасу «Чырвоны Партызан» Жук, член праўленьня Барчук 11-III 1930 г.».

Калі на сходзе калгасьнікаў адна бядняцка выказалася супроць абагульваньня жывёлы, член праўленьня настаўнік Барчук схапіў яе за каўнер і выпіхнуў з памяшканьня, дзе адбываўся сход.

Сакратар ячэйкі Энцін патурае ўсім гэтым скажэньням лініі партыі.

Такая «калектывізацыя» толькі на руку клясаваму ворагу. Кулакі ў Боркавіцкім раёне разьвіваюць энэргічную агітацыю супроць калгасаў. Пры гэтым яны скарыстоўваюць перагібы і галавацяцтва, дапушчаныя мясцовымі працаўнікамі.

Трэба зараз-жа праверыць склад калгасу «Чырвоны Партызан» і ячэйкі КП(б)Б. Тых, хто ўпарта не жадае выконваць дырэктыў партыі, трэба безадкладна зьняць з работы і прыцягнуць да адказнасьці.

Брыгадзір «Зьвязды» ХАЛЯВІН.

ПРЫМІРЭНЧЫЯ АДНОСІНЫ ДА КУЛАКА

Па меры набліжэньня сяўбы ў раёнах суцэльнай калектывізацыі ўсё больш завастраецца клясавае змаганьне. Кулацтва зараз імкнецца сарваць непасрэдны выхад калгасьнікаў у поле. У Слуцкім раёне суцэльнай калектывізацыі, дзе кулацкая праслойка больш моцная, клясавае змаганьне мае вельмі абвостраны характар.

У калгасе «Рухавік», Сяраскага сельсавету, кулакі і падкулачнікі арганізавалі падворны абход калгаснікаў і вялі агітацыю, каб яны выйшлі з калгасу. Кулацкі «агітпроп» сфабрыкаваў кучу фікцыйных заяў аб выхадзе з калгасаў і распаўсюджвае іх сярод калгаснікаў. Пакуль кулацкая правакацыя была выкрыта, некаторыя калгаснікі паддаліся на гэту вуду.

У той час, калі кулак разьвівае шалёную агітацыю за зрыў веснавой сяўбы, некаторыя мясцовыя працаўнікі праяўляюць прымірэнчыя адносіны да кулацтва. Некаторыя змаганьне з перагібамі ў калгасным будаўніцтве зразумелі, ня як далейшае замацаваньне калгасаў, а як здачу пазыцый кулацтву, і нічога ня робяць для спыненьня кулацкай контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці. У вёсцы Клянчаны (калгас «Камбайн») раскулачаны кулак Лясун прышоў да старшыні праўленьня калгасу прасіць каня. Старшыня, ня доўга думаючы, выдаў кулаку калгаснага каня, на якім ён паехаў у горад. Такія факты прымірэнчых адносін да кулака мелі месца і ў некаторых іншых мясцох Слуцкага раёну.

Да пачатку сяўбы засталося зараз вельмі мала часу. Гэты кароткі тэрмін трэба выкарыстаць, каб як мага лепш падрыхтавацца да выхаду ў поле. Таму кулацкім вылазкам і контррэвалюцыйным выступленьням трэба зараз даваць бязьлітасны адпор, у корані іх зьнішчыць. Трэба біць па тых, хто змаганьне з перагібамі ў галіне калектывізацыі разумее, як здачу пазыцый клясаваму ворагу.

Брыгадзір «Зьвязды» КАРАЧУН.

Як ідзе падрыхтоўка да агляду грамадзкага харчаваньня

25-га сакавіка пры рэдакцыі газэты «Зьвязда» адбылося пасяджэньне цэнтральнай камісіі па аглядзе грамадзкага харчаваньня. Былі заслуханы справаздачы Белкаапсаюзу, МЦРК і ЦП саюзу нархарч аб тым, як ідзе падрыхтоўка да правядзеньня агляду. Выявілася, што ні Белкаапсаюз, ні МЦРК на праявілі амаль ніякай падрыхтоўкі.

Цэнтральная камісія пастанавіла прасіць ЦКК НК-РСІ прыцягнуць да адказнасьці тыя арганізацыі, якія ня выконваюць дырэктыў аб правядзеньні агляду.

Пастаноўлена таксама прасіць аддзел друку ЦК КП(б)Б узьдзейнічаць на акруговыя газэты, каб яны кіравалі аглядам і вялі сыстэматычную работу па правядзеньні агляду.

Прынята пастанова арганізаваць выстаўку грамадзкага харчаваньня. Будуць прачытаны радыё-даклады і лекцыі прысьвечаныя агляду. У Гомельшчыну і Віцебшчыну выедуць спэцыяльныя рабочыя брыгады.

30-га сакавіка склікаецца нарада аглядавай камісіі.

Згуртаваная беднота дае рашучы адпор кулацкім вылазкам

Там, дзе бедната згуртавана, дзе сярод беднаты і батракоў вядзецца шырокая растлумачальная работа, у тых мясцох кулацкая агітацыя сустракае жорсткі адпор. Вось характэрныя прыклады.

У вёсцы «Сьвятое» (Рагачоўскі раён, Бабруйскае акругі) 11-га сакавіка адбыўся сход. На гэтым сходзе кулакі і падкулачнікі павялі шалёную агітацыю супроць калгасу і выступалі з правакацыйнымі заявамі, быццам новы статут с.-г. арцелі азначае ліквідацыю калгасаў. Пад уплывам кулацкай агітацыі сход пастанавіў ліквідаваць калгас, разабраць насеньне. Для ліквідацыі калгасу была нават вылучана камісія, у якую трапілі кулакі.

Але беднота адразу-ж мабілізавала ўсе свае сілы для адпору кулацтву. 13 сакавіка быў праведзен сход беднаты з серадняцкім актывам, які абгаварыў і аднагалосна зацьвердзіў новы статут калгасу. Пасьля гэтага адбыўся агульны сход вёскі. Кулакі на гэты раз зрабілі спробу сарваць сход, але атрымалі жорсткі адпор ад беднаты і сераднякоў. Сход пастанавіў—калгас ні ў якім разе не ліквідаваць, насеньне не разьбіраць, выбраную на мінулым сходзе камісію распусьціць, кулакоў-шкоднікаў калектывізацыі—прыцягнуць да адказнасьці.

У вёсцы Сіліповаўка, дзе кулакі ўвесь час вялі шкоднікую работу, імкнуліся разваліць калгас, сход беднаты разам з серадняцкім актывам пастанавіў: «раз назаўсёды адмовіцца ад дробнай паасобнай гаспадаркі, усімі сіламі ўзмацніць калгас і шпаркім тэмпам разгарнуць калгасьнікам, якія згодзяцца абагульваць усю жывёлу.

Калі на сходзе калгасьнікаў адна бядняцка выказалася супроць абагульваньня жывёлы, член праўленьня настаўнік Барчук схапіў яе за каўнер і выпіхнуў з памяшканьня, дзе адбываўся сход.

Сакратар ячэйкі Энцін патурае ўсім гэтым скажэньням лініі партыі.

Такая «калектывізацыя» толькі на руку клясаваму ворагу. Кулакі ў Боркавіцкім раёне разьвіваюць энэргічную агітацыю супроць калгасаў. Пры гэтым яны скарыстоўваюць перагібы і галавацяцтва, дапушчаныя мясцовымі працаўнікамі.

Трэба зараз-жа праверыць склад калгасу «Чырвоны Партызан» і ячэйкі КП(б)Б. Тых, хто ўпарта не жадае выконваць дырэктыў партыі, трэба безадкладна зьняць з работы і прыцягнуць да адказнасьці.

Брыгадзір «Зьвязды» ХАЛЯВІН.

ГАРОДНЫЯ КАЛГАСЫ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ НАСЕНЬНЕМ

Весткі з месц сьведчаць аб тым, што разьвіцьцю гароднінства ў БССР пагражае зрыў з прычыны адсутнасьці належнага кіраўніцтва і арганізаванасьці ў рабоце. Былі арганізаваны буйныя гародныя калгасы, пры чым у далейшым яны не атрымлівалі належнай дапамогі і кіраўніцтва з боку Саадкалгасаюзу, і некаторыя з іх ужо распаліся.

Да гэтага часу не ва ўсіх калгасах складзены вытворчыя пляны. Дрэнна таксама стаіць справа з арганізацыяй працы ў гародных калгасах. Напрыклад, хоць гной і вывозіцца на гародныя палі, але прадукцыйнасьць работы вельмі слабая, адсутнічае арганізаванасьць, няма вучоту людзей, цягавай сілы і г. д. Ніякай растлумачальнай падрыхтоўчай работы сярод агародніка-калгаснікаў не праводзілася, у зьвязку з чым наглядаецца блытаніна ў рабоце новых калгасаў.

Дрэнна стаіць справа з забесьпячэньнем гародных калгасаў насеньнем. Адчуваецца нястача ў цэлым радзе гатункаў насеньня гароднины. Наркамгандаль БССР зьвярнуўся ў Саюзны Наркамгандаль з просьбай аб дадатковым водпуску насеньня. На гэту просьбу Саюзны Наркамгандаль адказаў тэлеграмай, у якой гаворыцца:

«Нас вельмі здзіўляе ваша просьба, наколькі прадстаўнік БССР т. Талапіла заявіў на нарадзе пры Наркамземе СССР аб тым, што Беларусь поўнасьцю забясьпечана насеньнем».

Тав. Талапіла, да якога наш супрацоўнік зьвярнуўся за растлумачэньнем, заявіў, што на нарадзе Саюзнага Наркамзему ён толькі гаварыў аб поўным забесьпячэньні насеньнавых станцый. Чамусьці там не зразумелі і лічаць, што БССР пакуль што дадатковага насеньня ным насеньнем гароднины.

Такім чынам, з прычыны блытаніны, БССР пакуль што дадаткова насеньня не атрымала.

Ня лепш стаіць справа з кантрактацыяй прадукцыі гародных калгасаў. Пасьпяховае заключэньне ўмоў на кантрактацыі яшчэ не гарантуе, што гэтыя дагаворы будуць выкананы. Каапэрацыя, якая больш за ўсіх зацікаўлена ў пасьпяховым выкананьні дагавораў на кантрактацыі, павінна наладзіць кантроль і нагляд за падрыхтоўкай да сяўбы гародных калгасаў. Зараз-жа павінны быць вылучаны спэцыяльныя рабочыя брыгады, якія-б дапамагалі гародным калгасам у складаньні вытворчых плянаў, у адшуканьні неабходнага насеньня і г. д.

Справа разьвіцьця гароднінства ў БССР, пасьпяховая і своячасовая сяўба ў гародных калгасах — павінны стаць задачай на бліжэйшы перыяд часу ва ўсіх дзяржаўных, грамадзкіх і прафэсыянальных арганізацый.

А.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

43 вагоны з будаўнічым матар'ялам—у балоце

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Ня гледзячы на самыя жорсткія дырэктывы з боку РСІ аб своячасовым забесьпячэньні будаўніцтва патрэбнымі матар'ялам, прарывы на фронце будаўніцтва яшчэ не ліквідаваны. Чыгунка праявіла самыя нядбайныя адносіны пры дастаўцы матар'ялаў: каменьні былі выгружаны ў такім месцы, адкуль нельга вывазьці. У балоце апынуліся 43 вагоны каменьняў. Пяском і гравіем Белдзяржбуд забясьпечаны толькі на 40 проц., бярвеньнямі — на 10 проц.

Да апошняга часу не ўрэгулявана пытаньне з транспартам. Летась у гэты час працаваў абоз у 545 коняй, а зараз ёсьць толькі 90. Пляны будаўнічых работ распрацаваны ўсяго на палову. Патрэбны тэрміновыя меры для ліквідацыі прарываў, якія пагражаюць будаўнічаму сэзону.

КАЛГАСЫ АТРЫМАЛІ НОВЫХ 135 ТРАКТАРЫСТЫХ

Г

УВАГА!!!

Як рабкорам і рэдкалегіям насьценгазэт удзельнічаць у праверцы выкананьня дагавораў па сацспаборніцтве,

янім чынам можна паступіць у Дзяржаўны Інстытут Журналістыкі,

якія адносіны маюць рабкоры і рэдкалегіі да падрыхтоўкі кадраў для цэнтральных і акруговых газэт Беларусі—

гэтыя пытаньні будуць абгаварвацца **на АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІМ СХОДЗЕ** рабкораў і рэдкалегій насьценгазэт, які адбудзецца 31 сакавіка, а 7 гадз. веч., у памяшканьні рэдакцыі газэты **„ЗЬВЯЗДА“**.

З лістоў рабселькораў

КАШТОЎНЫЯ АДКІДЫ МАРНА ГІНУЦЬ

Пры апрацоўцы будаўнічага матар'ялу на нашых лесазаводах атрымліваецца каля 20 проц. пілавіньня і інш. адкідаў, якія трэба выкарыстаць у хэмічнай прамысловасьці. Сотні тысяч пудоў пілавіньня марнуюцца дарма без усялякага эфэкту. Між тым, з гэтых адкідаў можна было-б атрымаць шляхам перагонкі вельмі каштоўныя прадукты. Так, напрыклад, з 250 пуд. пілавіньня можна вытнаць каля 96 клг. дрэўнага сьпірту, вонтаравай кіслаты 128 клгр., смалы 192 клгр. На ўсе гэтыя прадукты ёсьць вялікі попыт.

Адпаведныя органы, і ў першую чаргу ВСНГБ, павінны зацікавіцца гэтай вельмі важнай справай і падумаць аб пабудове ў БССР заводу для пераапрацоўкі ўсіх гэтых адкідаў.

І. Чарняк.

ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ РАБОЦЕ УДАРНІКАЎ

Рабочыя грабіёвага цэху **галянтарэйнае фабрыкі «Беларуска»** працуюць у антысанітарных умовах. Рабочыя абвязыцілі сябе ўдарнікамі; арганізавалася ўдарная брыгада, але ахова працы ў гэтым цэху ў занепадзе. Цэх завалены вадкімі матар'ялямі. Тут-жа сярод іх даводзіцца працаваць і рабочым. Яшчэ некалькі месяцаў таму назад цэх атрымаў выцяжныя трубы, якія былі павешаны на сьценах аддзяленьня, але яны дрэнна зроблены і не працуюць.

Ад таго, што ў цэху ахова працы пастаўлена кепска, кожны дзень бываюць нявыхады рабочых на рабоце на хваробе. Некаторыя рабочыя хварэюць цэлымі месяцамі, цэхавая адміністрацыя ня ўжывае ніякіх захадаў для зьнішчэньня ўсіх гэтых ненармальнасьцяй.

Некалькі тыдняў таму назад наш грабіёвы цэх абсьледаваў прадстаўнік Наркампрацы, але ён больш сядзеў у канторы дырэктара, чым у цэху.

Рабочыя патрабуюць ад Наркампрацы ўсебаковага абсьледваньня работы гэтага цэху і зьнішчэньня ненармальнасьцяй у яго дзейнасьці.

Рабочы.

МЦРК НЕ ЗВАРАЧВАЕ ЎВАГІ НА АДКОРМАЧНЫЯ ПУНКТЫ

Ня гледзячы на тое, што адкормачныя пункты павінны адыгрываць вельмі важную ролю ў забесьпячэньні рабочых мясам, на гэту справу нашы гаспадарчыя арганізацыі не зварачаюць належнае ўвагі.

Так, Менскі МЦРК пабудаваў для адкормачнага пункту на Серабранцы новыя баракі, дзе можна трымаць больш за 1.000 сьвіней для адкорму. Але пабудова гэта яшчэ ня скончана: баракі без страхі, між тым, у іх заганяецца жывёла, якая ад вільгаці ў бараках вельмі часта хварэе.

Ня гледзячы на тое, што прафэсыянальныя арганізацыі і адміністрацыя пункту некалькі раз заяўлялі праўленьню ЦРК аб ненармальнасьцях на пункце, апошняе, нічога канкрэтнага ня робіць. Трэба прымусіць МЦРК больш сур'ёзна адносіцца да такое важнае справы, як адкормачныя пункты.

КАПЛАН.

НА ДАПАМОГУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Парт'ячэйка і бюро калектыву ЛКСМБ **Менскага палітэхнікуму** правялі вялікую працу сярод студэнтаў у адносінах дапамогі калектывізацыі вёскі. З 70 студэнтаў тэхнікуму арганізавана ўдарная брыгада, якая ў падшэфных вёсках рамантуе с.-г. інвэнтар для сялян, дапамагае збору насеннага фонду і абагульненьню апошняга. Нядаўна студэнты паладзілі суботнік, які даў 400 руб. Усе гэтыя грошы адданы на пабудову трактарнай калёны. Усяго-ж з раней сабранымі сродкамі студэнты перадалі на пабудову трактарнай калёны 1.000 руб. Студэнты ладзяць сыстэматычныя выезды ў падшэфныя палітэхнікуму вёскі, дзе ліквідуюць няпісьменнасьць сярод сялянства.

В. Сарока.

НЕ СКАРЫСТОЎВАЮЦЬ СПЭЦЫЯЛІСТЫХ — «ДАРОЖНІКАЎ»

У мінулым годзе пры Белдратрансе былі адкрыты курсы дарожных майстроў і дзесятнікаў на 70 чал. Усяго на курсы было патрачана больш 10.000 руб. Усе скончыўшыя гэтыя курсы павінны былі быць пасланы на работу нізавых кіраўнікоў дарожнага будаўніцтва. Але зараз выявілася, што многія са скончыўшых курсы нават да гэтага часу не выкарыстоўваюцца па прызначэньні. Некаторая частка былых курсантаў зусім пакінула работу на дарожным транспарце.

Менскі дарожны аддзел замест таго, каб усіх гэтых новых спэцыялістых прызначыць на пасады дарожных дзесятнікаў, накаторых з іх зусім зьняў з працы, а на пасады дзесятнікаў накіраваў малакваліфікаваных асоб.

В. МЕНСАК.

ХТО БУДЗЕ АДКАЗВАЦЬ ЗА ГАЛАВАЦЯПСТВА

Яшчэ ў канцы сьнежня мінулага году Белрадыёцэнтр паслаў Наркамзему стандарт слупоў для радыёфікацыі БССР. Робячы гэты заказ Наркамзему, Белрадыёцэнтр паказаў даўжыню слупоў у 8,5 мэтраў і таўшчыню ў верхнім адрубе—4,5 сант.

Атрымаўшы гэту прапанову, НКЗ прыступіў да загатоўкі слупоў. Але якраз праз два месяцы, калі ўжо шмат слупоў было загатоўлена, Белрадыёцэнтр чамусьці перадумаў і паведаміў НКЗ, што ў першай спэцыфікацыі зроблена, бачыце, памылачка: таўшчыня ў верхнім адрубе павінна быць не 4,5 сант., а 16-22 сант.

Хто будзе адказваць за дарма патрачаныя грошы і матар'ял.

Блюмін.

За невыкананьне дырэктыў аб каапэраваньні беднаты — да адказнасьці

Калегія Менаддзяленьня Белкаапсаюзу, азнаёміўшыся з работаю спажывецкіх таварыстваў аб каапэраваньні беднаты і батрацтва, пастанавіла — за невыкананьне дырэктыў аб 100-процантным каапэраваньні беднаты абвясьціць вымову праўленьням Радашковіцкага, Чэрвенскага, Халопеніцкага, Смалевіцкага, Верхменскага і Жодзінскага спажывецкіх таварыстваў. Апрача таго, усе гэтыя праўленьні папярэджаны, што ў выпадку невыкананьня дырэктывы аб 100-процантным каапэраваньні беднаты і батрацтва справа аб іх будзе перадана ў судовыя органы.

Грамадзкае харчаваньне ў жактах

Паводле прыкладу праўленьня жакту № 16 у Менску пачалі арганізоўвацца грамадзкія сталоўкі пры жактах. Зараз ужо адкрыта яшчэ адна сталоўка пры жакце № 22. У хуткім часе скончыцца рамонт сталоўкі жакту № 13. У пасёлку імя 1-га Мая будуецца новая сталоўка, урачыстае адкрыцьце якое прыстасавана да першамайскіх сьвят. Апрача таго, рамантуюцца спэцыяльныя памяшканьні для сталовак пры жактах № 3, 4 і 10.

Надаючы важнае значэньне гэтым сталоўкам, у справе грамадзкага харчаваньня, Белжылсаюз выдаў жактам крэдыт у 50.000 руб. на пабудову і рамонт гэтых сталовак.

Гукавое кіно ў Менску

Белдзяржкіно распрацавала канкрэтны праект гукавога кіно, якое будзе адчынена сёлета ў Менску.

Пад памяшканьне гукавога кіно мяркуецца абставляць новы будынак кіно «Чырвоная Зорка». Урачыстае адкрыцьце гукавога кіно будзе прыстасавана да 10-ай гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

40.000 р. на барацьбу з бяспрытульнасьцю

Цэнтральная камісія па разьмеркаваньні фонду імя Леніна выдала ЦВК БССР 40.000 руб. на дапамогу дзецям і змаганьне з бяспрытульнасьцю. Грошы перададны цэнтральнай дзіцячай камісіі.

Крэдыты на пабудову 2-й раённай электрастанцыі

СНК асигнаваў на пачатак будаўніцтва 2-й раённай электрастанцыі ў Гомелі 500.000 руб.

Стаўкі каморнікам на летні пэрыяд

На час з 1-га красавіка па 1-га кастрычніка разьмер асноўных ставак тэхнікам - каморнікам павялічваецца да 75 руб. і дзесятнікам да 70 руб. Замест сутачных на гэты час ўстанаўляецца цьвёрдая процантная надбаўка да 85 проц. Для прэміраваньня за колькасьць і якасьць работы стварэецца спэцыяльны прэміяльны фонд. Захоўваючы існуючыя надбаўкі за кліматычныя ўмовы для зямляўпарадчыкаў у Мазырскай і Полацкай округах.

Перадача саўгасаў саюзным трэстам

Савет Народных Камісараў БССР у мэтах лепшай арганізацыі насеннай справы пастанавіў перадаць Саюзнаму насеняводнаму трэсту 18 саўгасаў Белсельтрэсту і гаспадарку «Забалацьце» пры Тураўскай даследчай станцыі.

Адначасова Савет Народных Камісараў запрапанаваў НКЗ перадаць усесаюзнаму сьвінагадоўчаму трэсту 36 савецкіх гаспадарак Белсельтрэсту, якія знаходзяцца ў розных округах БССР.

Пабудова мясного камбінату ў Віцебску

Эканамічная Нарада БССР прызнала неабходным безадкладна прыступіць да пабудовы ў г. Віцебску бойні палепшанага тыпу з падсобнымі прадпрыемствамі. Пры бойні будзе арганізаваны адкормачныя пункты на 100 сьвіней. Кошт пабудовы бойні—2,5 млн. руб.

ЗА ДЗЕНЬ

— У Менску адкрыўся **чарговы пленум ЦП саюзу мэдсанпрацы.** Пленум абгаворыць рад пытаньняў прафсаюзнай работы.

На летні сэзон Менская акруговая страхкаса атрымала **134 курортныя месцы.** Усе месцы будуць разьмеркаваны па прафсаюзах.

— **Беларускі вандроўны тэатр** скончыў падрыхтоўку да выезду ў калгасы. Тэатр выяжджае з 5-га красавіка па 20 дзён. Яўрэйскі вандроўны тэатр выяжджае ў раёны БССР з 1-га красавіка на 2 з паловай месяцы.

— Усе **кіно-тэатры Менску** перайшлі на работу з 12 гадзін дня да 12 гадзін ночы для абслугоўваньня рабочых, якія перайшлі на бесьперапынку і працуюць у вячэрнюю зьмену. Кошт білетаў па дзённым кіно - сэансы зьніжаны.

На 7-гадзінны рабочы дзень

Гэтымі днямі пры сэктары вытворчасьці і зарплаты ЦСПСБ адбылася нарада з удзелам прадстаўнікоў ЦП саюзаў, гаспадарчых органаў і НКПрацы. На нарадзе абгаварвалася пытаньне аб пераводзе прадпрыемстваў на 7-гадзінны рабочы дзень.

Нарада пастанавіла перавесьці прадпрыемствы на 7-гадзінны рабочы дзень на працягу пяцігодкі наступным парадкам: у 1929-30 гаспадарчым годзе прадпрыемствы пераводзяцца на 7 гадз. работы на 45 проц., у 1930-31 г.—на 80 проц. У 1931-32 г. усе прадпрыемствы ў БССР павінны быць поўнасьцю пераведзены на 7-гадзінны рабочы дзень.

Нарада выказалася за тое, каб сёлета на 7-гадзінны рабочы дзень былі пераведзены наступныя прадпрыемствы: завод «Энэргія»—Менск, іголкавая фабрыка—Віцебск, папяровая ф-ка «Гэрой Працы»—Добруш, шпалерная ф-ка імя Крупскай—Менск. Палесдрук—Гомель, кафэльна-плітачны завод «Прапетары»—Копысь, алейны завод «Зара»—Магілеў, алейны завод імя Калініна—Віцебск і алейны завод у Бабруйску.

Нарада адзначыла, што да гэтага часу прафсаюзныя гаспадарчыя арганізацыі зусім не займаліся гэтай справай. У бліжэйшы час пытаньне аб пераводзе зазначаных прадпрыемстваў на 7-гадзінны дзень будзе вырашацца ўрадавай камісіяй пры СНК БССР.

Мабілізацыя спэцыялістых на сплаў

Для правядзеньня сплаўнай кампаніі па Беларусі мабілізуецца 300 спэцыялістых лесаводаў - сплаўшчыкаў, а таксама студэнтаў лясного факультэту Беларускай с.-г. акадэміі і старшых курсаў лясных тэхнікумаў.

ПАЖАР

Учора а 5 гадз. веч. па вуліцы Валадарскага ў сушыльні Аб'яднанай прафтэхшколы выбухнуў пажар. У сушыльні знаходзіўся вагон дошчак. Згарэла 25 проц. дошчак. А 8 з пал. гадз. веч. пажар быў ліквідаваны.

У тушэньні пажару прымалі ўдзел цэнтральная гарадзкая і добраахвотніцкая часьці пажарных каманд.

РОДИТЕЛИ!

сделайте детям лучший подарок

ВЫПИШИТЕ

на более длительный срок детский журнал

МУРЗИЛКА

(для ребят возраста от 4—9 л.)

и

журнал **ОГОНЬКИ**

(для ребят возраста от 7—12 лет)

Поторопитесь подписаться при подписке на **АПРЕЛЬ** *ДО КОНЦА ГОДА*

в Белорусском Отделении Изд-ва **„ПРАВДА“** (Советская, 61) и у газетоносцев у себя на ДОМУ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена» сумесна з Мен. АК ЛКСМ і ячэйкай архітэктараў палітэхнікуму палладжвае 28 сакавіка ў 19½ гадз. увеч. у клюбе працасьветы дыспут **аб прынцыпах пабудовы дамоў - камун. Даклад тав. Шчарбакова.**

На дыспут запрашаюцца прадстаўнікі АК КП(б)Б, БЖС, МБІТ, ЦСПСБ, ВСФКВ, будаўнікі, камсамольцы і рабочая моладзь. На дыспуце выстаўка праектаў дамоў-камун.

30 сакавіка ў 19 гадз. у доме Камасьветы адбудзецца вечар партыйнага і камсамольскага актыву гарбарных прадпрыемстваў. Будзе зроблены даклад на тэму: «Прамфінплян гарбарнай прамысловасьці на бягучы год і задачы партработы». Пасьля дакладу канцэрт і кінофільм. Білеты па ячэйках.

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У 19 гадз. (пакой № 21) індывід. консульт. тав. **Сапронава** аб задачах калектывізацыі і веснавой пасеўнай кампаніі.

З 19 да 21 гадз. заняткі гуртка ангельскае мовы (пак. № 3).

ЦП саюзу працасьветы. У 19 гадз. у памяшк. ЦП (дом Працы, 2-гі паверх, пак. № 18) будзе працаваць культурна-плянавы сэктар ЦП саюзу. Запрашаюцца т. т., якія запісаліся для працы ў гэты сэктар.

Дом Пісьменьніка. Агульны сход менскай філіі БелАПП'у ў 20 гадз. Яўка членаў філіі абавязкова. У 18 гадз.—пасяджэньне камфракцыі філіі.

Рэв. камісія Фрунз. райсавету Асавіяхіму склікае нараду ўсіх рэв. камісій Фрунзаўскага раёну. Пач. у 18 гадз. Яўка абавязкова.

Рэспубл. бюро АРУ. 31 сакавіка, а 7 г. увечары, у памяшканьні клюбу Саўгандальслужачых адбудзецца **агульна-гарадзкі сход членаў АРУ г. Менску.**

Парадак дня:

1) Вышкі і рашэньні ўсесаюзнай канфэрэнцыі АРУ; 2) Аб рэарганізацыі структуры АРУ.

Прысутнасьць усіх членаў АРУ абавязкова.

ЗАЎТРА

У 18 гадз. 30 мін. у памяшк. Бел. МБІТ адбудзецца пасяджэньне **аргбюро па сіліканьні першага беларускага энэргэтычнага зьезду,** на якім будуць заслуханы наступныя даклады: 1. Інфармацыя аб 5-м усесаюзным цёплатэхнічным зьезьдзе, 2. Пэрспэктывы забесьпячэньня палівам БССР на бліж. 10 год.

БДУ. У 20 гадз. у аўд. № 22 хэмкорпусу адбудзецца нарада па пытаньні аб арганізацыі вытворчых нарад. Павінны прысутнічаць члены мясцкомаў, прафактыў, выканбюро, члены прафкому, дэканы, іх намесьнікі і загадчыкі аддзяленьняў.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Пленум Райсавету Асо разам з асоавіяхімаўскім актывам **у 18 гадз.** у памяшк. Фр. РК КП(б)Б (пакой Асоавіяхіму). Сакратары яч. 1-й друкарні, ф-кі «Камунарка» і хлебазаводу павінны зьявіцца на пленум са справаздачамі аб рабоце яч. Асо.

Вайсковы габінэт БДУ. Інструкцыйная нарада кампаліт. і адм. складу запасу па пытаньні аб правядзеньні дня ваеннізацыі замест 31 сакавіка **прызначаецца на 30 сакавіка** ў 18 гадз. у вайсковым габінэце. Яўка студэнтаў БДУ гэтай катэгорыі абавязкова.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ВНИМАНИЮ РАБОЧИХ

СНИЖЕНА ЦЕНА НА „РАБОЧУЮ ГАЗЕТУ“

НОВАЯ ПОДПИСНАЯ ЦЕНА С ФЕВРАЛЯ в месяц 50 коп. До конца года 4 р. 50 к.

НОВАЯ РОЗНИЧНАЯ ЦЕНА С ЯНВАРЯ за отд. номер 2 коп.

Одновременно ОТКРЫТА ПОДПИСКА на 2-ой квартал и до конца 1930 г.

НА ВСЕ ИЗДАНИЯ ИЗДАТЕЛЬСТВА ЦК ВКП(б) «ПРАВДА»: газеты «Правда», «Комсомольская Правда», «Пионерская Правда» и журналы: «Большевик», «Коминтерн», «Революция и Культура», «Под Знаменем Марксизма», «Рабкор», «Прожектор», «Работница», «Экран», «Крокодил», «Хочу все знать», «Лицом к деревне», «Вожак», «Мурзилка», «Огоньки» и «Газетное Хозяйство».

Минск, Советская, 61 тел. №№ 8-21 и 7-03. Белорусское Отделение Издательства ЦК ВКП(б) «Правда»

У суботу, 29 сакавіка г. году роўна а 7 гадзіне ўвечары ў залі пасяджэньняў Менгарсавету (пляц Волі № 4, трэці паверх)

адбудзецца

пасяджэньне пленуму Савету

Парадак дня:

1) **Даклад ВСНГБ аб выкананьні прамфінпляну.**

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў Савету і прымацаваных абавязкова.

Запрашаюцца: старшыні фабзаўкомаў і вытворчых камісій, кіраўнікі прадпрыемстваў і трэстаў гор. Менску.

Ц. праўленьне саюзу саўгандальслужачых паведамляе, што сёньня, а 7 гадз. увеч. у памяшканьні клюбу саюзу саўгандальслужачых адбудзецца

ВЕЧАР калектывізацыі і пасеўкампаніі

з наступным парадкам дня: 1) даклад аб чарговых задачах калектывізацыі і пасеўкампаніі; 2) рапарты 3-х МК: ВСНГ, Дзяржгандбелу і НКЮ аб праробленай імі рабоце па пасеўкампаніі і калектывізацыі і двух брыгад, пасланых МК ЦСК і БКС у вёску для правядзеньня гэтай работы. Запрашаюцца на вечар увесь прафактыў нашага саюзу, а таксама і радныя члены саюзу.

29-га сакавіка, а 6-ай гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу харчавікоў (рог Пушкінскай і Дзяржынскай вуліц) прэзыдыум Бабруйскага акрараф-бюро і рэдакцыя газэты «ЗЬВЯЗДА» склікаюць

бабруйскую агульна-гарадзкую канфэрэнцыю чытачоў газ. „Зьвязда“

ПАРАДАК ДНЯ:

1) **Даклад рэдакцыі газэты „Зьвязда“.**
2) **Мастацкая частка.**

Уваход па разасланых білетах.

Прэзыдыум АПБ, рэдакцыя «Зьвязды».

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА ВЫШЛА З ДРУКУ І ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ **Парадак арганізацыі МАШЫНА-КОННЫХ станцый ў калгасах БССР**

Стар. 48. Цана 10 кап.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сэзон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Пятніца, 28 сакавіка. Адкрыты спэктакль. **Б. Лаўрэнеў.** РАЗДОМ П'еса ў 4 дзеях.

Білеты ў рабочай касе і ў касе театру. Пачатак роўна а 8 гадз.

ГАТЭЛЬ САВОЙ

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — Апошнія 3 дні 28, 29 і 30 сакавіка. ХАЦІНА ДЗЯДЗЬКІ ТОМА кіно-п'еса ў 6 част. Звыш праграмы ДАГЭСТАН культур-фільм у 2-х част. Дзённыя сэансы: а 1 г. дня 13 г. 15 м. Вячэрнія сэансы: а 7 г., 8 г. 30 м і 10 г. 30 м. Каса ад 5 г. увеч.

КІНО Рэвэрцыянэр — Грандыёзны фільм вытворчасьці ф-кі культурфільм «СОВКІНО» ГІГАНТ. Звыш праграмы Амэрыканская комэдыя у 2-х часткі. Дзённыя сэансы: а 1 г. 30 м., 3 гадз. Каса—ад 12 гадз. дня.

КІНО Пралетарый — Амэрыканск. фільм вытв. «Парамонт-фільм» У ДОКАХ НЬЮ-ЁРКУ драма ў 8 частках. Рэжысэр Джозэф Штэрнбэрг. Штодзённа 4 сэансы: а 5 гадз. 45 м., 7 г. 25 м., 9 г. 05 м. і 10 гадз. 45 м. КАСА адкрыта ад 1 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр Юны Піянэр — Палітасьветфільм БАЙКАЛ ВОЛХАЎБУД у 6-ці частках у 1-й част. Звыш праграмы. Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз., 2-га—3 г. 30 м. Каса адчынена ад 11 г. 30 м.

КІНО Спартак — Звыш праграмы гастролі гумарыстата-сатырыка Пятра САКОЛЬСКАГА. На экране мастацкі фільм ПУРГА драма ў 7 ч. Пачатак 1 с. а 7 г. Каса—ад 5 г. 30 м.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА“ — 3 пятніцы, 28 сакавіка. З прычыны вялікага посьпеху апошнія 3 дні 28, 29 і 30 сакавіка на вячэрніх і дзённых кіно-сэансах ДЭМАНСТРУЕЦЦА МАСТАЦКІ ФІЛЬМ У 6-ці ЧАСТКАХ **ХАЦІНА ДЗЯДЗЬКІ ТОМА** кіно-п'еса ў 6-ці частках. Рэжысэр ГАРЫ ПОЛАРД. Звыш праграмы **ДАГЭСТАН** культур-фільм у 2-х част. ПАЧАТАК ДЗЕННЫХ СЭАНСАЎ: 1-га—а 1 гадз. дня, 2-га—а 3 гадз. 15 м. На дзённыя сэансы цэны зьніжаны ад 10 к. да 35 к. ПАЧАТАК ВЯЧЭРНІХ СЭАНСАЎ: 1-га—а 7 гадз., 2-га—а 8 г. 30 м., 3-га—а 10 г. 30 м. **Каса ад 5 гадз.**

Менская Акруговая Ашчадкаса даводзіць да ведама ўкладчыкаў, што з прычыны складаньня наўгадавой справаздачы **будуць спынены апэрацыі** увесь дзень **31 САКАВІКА** ў Акруговай Касе і ў 2-м аддзяленьні пры Дзяржбанку, **а 1-га красавіка** ў 1-м аддзяленьні на пл. Волі.

ОТКРЫТ ПРИЕМ на ЗАОЧН. ФОТО- и КИНО-КУРСЫ О. К. С. Б. (Общество друзей советской кинематографии) ПО ОТДЕЛЕНИЯМ: **ФОТО** отделение; **КИНО** механиков-передвижников; **КИНО**-сценаристов; **КИНО** механиков ст. кино-уст. новок.

Слушатель может быть зачислен в идущую группу или вновь начинающую. Стоимость обучения за весь курс по отделениям:
1) фото-отделение . . . 15 руб.
2) кино-механиков передвижников . 15 руб.
3) кино-механиков стационарников . 18 руб.
4) кино-сценаристов . . . 20 руб.
Подробные сведения даны в проспекте, который высылается по первому требованию за 10-коп. марку. Все запросы и деньги нужно посылать по адресу: Издательство „Теакинопечать“, Москва, 9, Страстной бул., 247 Отдел Заочных Курсов № 83.

ОРГСТРОЙ — У зьвязку з наступленьнем другога паўгодзьдзя 1929-30 г. БЕЛАРУСКАЙ КАНТОРАЙ **„ОРГСТРОЙ“** атрыманы поўны асартымэнт **абсталяваньня для капірвучота.** Пераход на капірвучот магчымы і мэтазгодны з 1-га чысла кожнага месяца, выдаткі на абсталяваньне значна меншыя чым пры кніжнай форме бухгалтэрыі, пераход на капірвучот гарантуе тэхнічны ажур, яскравасьць і чоткасьць і дае эфэкт на прадпрыемствах гандлёвых, вытворчых і інш., а таксама у адміністрацыйных установах, якія знаходзяцца на дзяржбюджэце.

Заказы накіроўваць па адрасах: «ОРГСТРОЙ»—г. Менск, Савецкая 55. Магазін «ОРГСТРОЯ»—г. Менск, пляц Волі 5.

Агенцтвы: у г. Гомелі—Савецкая, 17, у г. Віцебску—Ленінская, 49.

ДЗЯРЖБАНК ПАВЕДАМЛЯЕ ЎСЮ СВАЮ КЛІЕНТУРУ, што, ў сувязі з ударнай работай і пераходам на новую намэнклатуру балянса пры крэдытнай рэформе, **31 САКАВІКА** ніякіх апэрацый вытварацца ня будзе.

Беларуская Дзяржаўная Акадэмія Сельскае Гаспадаркі АБВЯШЧАЕ: **ПРЫЁМ ЗАЯЎ** на паступленьне ў Акадэмію **ПРАЦЯГНУТ да 5-га красавіка г. г.** Іспыты пачнуцца 1-17-30 г. Правілы прыёму вывешчаны у газэце «Зьвязда» ад 17 і 18 сакавіка г. г. Рэктар Акадэміі ПІНЧУК П. І.

БЕЛОРУССКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ **ЦЕНТРАЛЬНОГО ИЗДАТЕЛЬСТВА НАРОДОВ СССР** Минск, площадь Свободы, 17. Тел. № 3-33 доводит до сведения, что в 1930 и 1931 году будут выпущены

САМОУЧИТЕЛИ

АНГЛИЙСКОГО ЯЗЫКА сост. С. Мамонова и С. Толстой 20 выпусков. Курс рассчитан на 2 года.

НЕМЕЦКОГО ЯЗЫКА сост. Б. Шмелев 20 выпусков. Курс рассчитан на 2 года.

Самоучители составлены по усовершенствованным методам и ставят себе задачей дать возможность каждому, в кратчайший срок с небольшой затратой времени изучить в совершенстве немецкий или английский язык. Самоучителем можно пользоваться как курсом заочного обучения.

Подписная цена за отдельный курс: при подписке на все 20 выпусков—5 руб., на 10 выпусков—3 руб.

РАЗГОВОРНИКИ АНГЛИЙСКОГО и НЕМЕЦКОГО ЯЗЫКОВ ФРАЗЕОЛОГИЧЕСКИЕ СЛОВАРИ.

Необходимое пособие для лиц, едущих за границу, и также рабочего и партактива для бесед с приезжающими в СССР иностранцами на политические, производственные и бытовые темы. Обращение простое, доступно каждому, кто только умеет читать.

УДОБНЫЙ КАРМАННЫЙ ФОРМАТ. По 10 выпусков на каждом языке.

Цена при подписке на 10 выпусков — 5 руб., при подписке на 5 выпусков — 3 рубля.

ДОПУСКАЕТСЯ РАССРОЧКА.

С 1-го апреля 1930 года подписку для г. Минска принимает **КНИЖНАЯ БАЗА ЦЕНТРИЗДАТА** (*Минск, Комсомольская, д. № 5*), для иногородних—**БЕЛОРУССКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ** *Минск, площадь Свободы, 17.*

При подписке 1-й выпуск выдается подписчику на руки.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты **„ЗЬВЯЗДА“** званоце па тэл. **2-49**

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту **„ЗЬВЯЗДА“** званоце па тэл. **7-81**

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.

Менск, Галоўлітбел № 337.